ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена



«Граблі» для… лесу



Спроба, якую лепш не ігнараваць



Жыццё пасля спайсу

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

2 САКАВІКА 2017 г. ЧАЦВЕР № 42 (28406)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## Бізнес, інвестыцыі, прамысловая кааперацыя...

### Рэкорды і новыя планы беларуска-грузінскага супрацоўніцтва

**Акрамя савецкага мінулага, у Беларусі і Грузіі ёсць шмат агульнага. Абедзве дзяржавы невялікія і па плошчы, і па насельніцтве, абедзве з атрыманнем незалежнасці аказаліся сам-насам з пагрозамі сучаснасці, абедзве сёння імкнуцца выконваць у сваіх рэгіёнах ролю сувязуючага звяна паміж Захадам і Усходам. Беларусь — сусветна вядомая мінскай пляцоўкай па ўрэгуляванні канфлікту ва Украіне. Будучы адной з заснавальніц ЕАЭС, наша дзяржава вылучае ідэю стварэння вялікай Еўропы ад Лісабона да Уладзівастока. У сваю чаргу, стратэгічнай мэтай знешняй палітыкі Грузіі з'яўляецца ператварэнне дзяржавы ў адзін з найважнейшых вузлоў транспартнага калідору Еўропа — Каўказ — Азія.**

СТАР. 2



Фота БЕЛТА.

# ПА ДАРОЗЕ ДА ГІСТОРЫІ




Фота БЕЛТА.

**У Гродне на старажытных вуліцах пачалі ўсталёўваць першыя інфармацыйныя шыльды, якія сведчаць аб тым, што было на гэтым месцы сто і больш гадоў таму. Незвычайныя пюпітры ўжо зацікавілі гараджан і гасцей горада. Шыльды па-беларуску, па-руску і па-англійску расказваюць мінакам аб вуліцы і аб тых славутых аб'ектах або ансамблях, якія на ёй знаходзіліся. Інфармацыя, падрыхтаваная аўтарытэтнымі гісторыкамі, падмацаваная старымі фота, на якіх відаць, як той ці іншы будынак выглядаў раней.**
**На фота: «Візітоўка» вуліцы Замкавай.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір МАКЕЙ, міністр замежных спраў:**

*«Я аптымістычна гляджу на развіццё двухбаковых адносін з нашымі расійскімі сябрамі. Нядаўна ў нас адбылася вельмі прадметная і канкрэтная размова з маім калегам Сяргеем Лаўровым. Ёсць агульнае разуменне таго, што трэба знаходзіць развязкі тых праблемных пытанняў, якія цяпер маюць месца, і рухацца наперад. Як некаторыя кажуць, Саюзнай дзяржавы ўжо не існуе. На нашу ж думку, яе хаваць яшчэ не час. Хачу адзначыць, што на сустрэчы з кіраўніком МЗС Расіі было дасягнута вельмі шмат дамоўленасцяў. Канцэптуальныя задачы нам ставяць нашы прэзідэнты. Наша задача заключаецца ў тым, каб рэалізаваць гэтыя даручэнні».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 2.03.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8955 | ▲ |
| Еўра | 1,9979 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0324 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0697 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X
17042

■ Гарадская гаспадарка

## Ад слоў да справы

### Як рэформа сістэмы ЖКГ у сталіцы падладжваецца пад рэальнае жыццё

**Неабходнасць пераўтварэння сферы жыллёва-камунальнай гаспадаркі спела доўгі час. Было відавочна, што шмат у чым яшчэ савецкая па спосабах функцыянавання сістэма не адпавядае сучасным запытам. У сакавіку 2015 года з двух раёнаў сталіцы пачаўся эксперымент у сферы ЖКГ, а ўжо ў канцы мінулага года Андрэй Шорац назваў укараненне рэформы сваім галоўным дасягненнем на пасадзе старшыні Мінгарвыканкама.**

Здавалася б, на паперы ўсё выглядае выдатна: і ідэі добрыя, і спосабы рэалізацыі нядрэнныя, але без паправак не абышлося, ды і, па справядлівасці кажучы, усё ж не магло абысціся, такое жыццё. Возьмем хоць бы адно з асноўных палажэнняў рэформы — падзел службаў падрадчыка і заказчыка. Калі раней усе абавязкі клаліся на плечы супрацоўнікаў ЖРЭА, то цяпер у ролі заказчыка выступаюць камунальныя ўнітарныя прадпрыемствы ЖКГ раёнаў, а абавязкі падрадчыка бяруць на сябе ўзбуйненыя ЖЭУ і не толькі яны: на рынак аказання гэтага тыпу паслуг нароўні з дзяржаўнымі службамі прыйшлі прыватнікі. Праўда, не ўсюды і не надоўга.

СТАР. 4

■ Дыскусія аб надзённым

## ЮРЫДЫЧНАЯ СІЛА МОВЫ

### Ці перакладуць на беларускую Кодэкс аб адукацыі?

**Цікавы факт: у 20-я гады мінулага стагоддзя, пасля ўтварэння СССР, выданне законаў на беларускай мове распачалося ў Маскве на два гады раней, чым у Мінску. Паводле першай Канстытуцыі СССР, дэкрэты і пастановы найвышэйшых дзяржаўных устаноў павінны былі друкавацца на шасці мовах: рускай, украінскай, беларускай, грузінскай, армянскай і цюрка-татарскай. І хоць законы не ствараліся па-беларуску, а перакладаліся з рускай мовы, гэта ўсё роўна было сур'ёзным крокам наперад, бо пачала стварацца юрыдычная тэрміналогія па-беларуску.**
**Амаль праз стагоддзе з дваццаці шасці кодэксаў Рэспублікі Беларусь, тэксты якіх прадстаўлены сёння на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале, па-беларуску надрукаваны толькі Кодэкс аб культуры. Чаму беларуская мова знікла са сферы заканадаўства і як рэалізуецца на практыцы дзяржаўнае двухмоўе, абмеркавалі ўдзельнікі круглага стала, які прайшоў у Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі. Да ўдзелу ў дыскусіі былі запрошаны прадстаўнікі органаў дзяржаўнага кіравання, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, вядучыя вучоныя, педагагічныя работнікі і аматары роднага слова.**

СТАР. 13

# Бізнес, інвестыцыі, прамысловая кааперацыя...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар)

Дарэчы, міралюбівасць беларускай палітыкі на самым пачатку перагавораў з кіраўніком нашай дзяржавы адзначыў **Прэзідэнт Грузіі Гіоргій МАРГВЕЛАШВІЛІ**. Ён прызнаўся, што неаднаразова бачыў кадры з Палаца Незалежнасці, бо гэта ўжо частка сусветнай гісторыі — з-за беларускага мірнага вопыту, добрай дыпламатычнай атмасферы.

### Паўшляху ўжо прайшлі

З-за пэўных палітычных і геаграфічных прычын кантакты паміж дзяржавамі развіваліся не вельмі інтэнсіўна. Але ўсё змянілася пасля візіту ў 2015 годзе ў Грузію **Прэзідэнта Беларусі Аляксандра ЛУКАШЭНКІ**. Два гады таму і кіраўнік нашай дзяржавы, і Гіоргій Маргвелашвілі падчас перагавораў убачылі цэлы шэраг перспектыўных кірункаў для развіцця супрацоўніцтва. Была пастаўлена задача вывесці двухбаковы тавараабарот на ўзровень 200 мільёнаў долараў. І для гэтага, як заўважыў учора ў вітальным слове беларускі Прэзідэнт, ужо напрацаваны добры фундамент:

— *Літаральна за некалькі гадоў мы здзейснілі прарыў у нашых адносінах. Сёння, на вялікае задавальненне, няхай гэта яшчэ не той тавараабарот, які павінен быць і які мы намецілі, але паўшляху мы прайшлі.*

Прэзідэнт нашай краіны асобна падзякаваў Гіоргію Маргвелашвілі за тую пазіцыю, якую займае Грузія ў міжнародных арганізацыях, у Еўрапейскім саюзе, на перагаворах з заходнімі дзяржавамі — калі падтрымлівае, адстойвае інтарэсы Беларусі.

### У Тбілісі ўжо зараз можна купіць беларускае...

Што да тавараабароту, то пастаўленая мэта цалкам дасягальная.

— *Нягледзячы на складанасць сітуацыі ў сусветнай эканоміцы, аб'ёмы гандлю паміж нашымі краінамі выраслі ў 2016 годзе на 63 працэнты і дасягнулі рэкорднага за апошнія пяць гадоў паказчыка — больш за 73 мільёны долараў. Сукупны тавараабарот з улікам кошту паслуг наблізіўся да стамільённай мяжы,* — канстатаваў Прэзідэнт Беларусі.

У Грузіі ўжо створана тавараправодная сетка беларускіх вытворцаў. Цікавы факт: у мінулым годзе ў Тбілісі адкрыўся магазін, што рэалізуе прадукцыю вядомай у нашай краіне фабрыкі «Пінскдрэў», а таксама два магазіны, дзе грузіны могуць набыць харчовую прадукцыю беларускай вытворчасці.

На думку кіраўніка нашай дзяржавы, неабходна задзейнічаць тыя рэзервы, якія маем, для далейшага росту. Эканомікі Беларусі і Грузіі дапаўняюць адна адну, і гэта дае перавагі ва ўзаемным напаўненні нашых рынкаў. У гэтым плане цікавасць прадстаўляюць пастаўкі беларускай тэхнікі, стварэнне сумесных вытворчасцяў і цэнтраў сэрвіснага абслугоўвання. Грузінскі бок мае значны патэнцыял экспарту ў Беларусь агароднiны, садавiны, віна...

— *Да таго ж ураджай вашых садоў і палёў можна перапрацоўваць сумесна,* — прапанаваў Прэзідэнт Беларусі грузінскаму калегу падчас перагавораў у пашыраным складзе. — *З гэтай мэтай мы гатовыя прадаць грузінскім кампаніям выгадныя ўмовы для вядзення бізнесу на нашай тэрыторыі, у тым ліку ў свабодных эканамічных зонах.*

### Інтарэсы фермераў і камунальнікаў

Кіраўнік нашай дзяржавы шчыра вітае разнапланавасць кантактаў.

— *Мы адчуваем, што ў нас добрыя адносіны, і на гэтай аснове гатовыя да любога супрацоўніцтва з Грузіяй, грузінскім народам,* — адзначыў ён. — *Мы будзем рады бачыць грамадзян Грузіі ў Беларусі і аказваць ім усялякую падтрымку.*

Яшчэ адзін перспектыўны кірунак — прамысловая кааперацыя. Беларускі бок працягвае работу над праектам зборкі ў Грузіі нашых трактароў малой магутнасці. Такім чынам, грузінскія фермеры будуць забяспечаны якаснымі і даступнымі па цане сродкамі механізацыі.

У найбліжэйшы час Грузія плануе ўзвесці лядовую арэну і біятлонны стадыён на гарналыжным курорце «Бакурыяні». Беларускія праектныя і будаўнічыя арганізацыі гатовы прапанаваць сваю дапамогу і па гэтым праекце.

Асаблівую цікавасць для ўзаемадзеяння ўяўляе сфера гарадской гаспадаркі, развіцця грамадскага транспарту і камунальных паслуг. Напрыклад, у нашай краіне апошнім часам створаны новыя высокатэхналагічныя вытворчасці. З адпаведнай прадукцыяй мы ўжо, дарэчы, прысутнічаем і на грузінскім рынку: у мінулым годзе ў Грузію былі пастаўлены цягнікі «Штадлер». Наша краіна, акрамя гэтага, зацікаўлена прыняць удзел у мадэрнізацыі ліфтавога абсталявання жылога фонду Грузіі. «Магілёўліфтмаш» прапануе здзейсніць у адным з раёнаў Тбілісі пілотны праект і ў далейшым распаўсюдзіць яго па ўсёй краіне.

Паступова цікавасцю да нашай краіны пранікаюцца грузінскія інвестары. У Беларусі зарэгістравана 25 прадпрыемстваў з удзелам грузінскага капіталу. У цэлым жа за 2016 год з Грузіі прыцягнута 1,6 мільёна долараў інвестыцый.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

■ Парламенцкі дзённік

# Дэпутаты перапрацуюць прававое поле Саюзнай дзяржавы

Пра ўмацненне рэгіянальнага супрацоўніцтва ішла гаворка на пасяджэнні Камісіі Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі па пытаннях знешняй палітыкі. Рэгіянальнае ўзаемадзеянне паміж Беларуссю і Расіяй паказвае добрыя вынікі, тым не менш прававая сфера тут патрабуе ўдасканалення. «На рэгіянальным узроўні рашэнні прымаюцца хутчэй і работа ідзе больш актыўна», — падкрэсліў **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАХМАНАЎ.**

Значную ролю стварэння прававой прасторы для супрацоўніцтва нашых рэгіёнаў адзначыў і **член Камітэта Савета Федэрацыі па федэратыўным уладкаванні, рэгіянальнай палітыцы, мясцовым самакіраванні і справах Поўначы Уладзімір ЛІЦЮШКІН.** «Гэтае пытанне дазволіць раскрыць магчымасці і патэнцыял на месцах, якія тамтэйшыя жыхары ведаюць лепш і больш прафесійна», — падкрэсліў ён і дадаў, што неабходна ствараць новыя саюзныя законы, а таксама выкарыстоўваць нарматыўныя прававыя акты Садружнасці Незалежных Дзяржаў.

Таксама Уладзімір Ліцюшкін выказаўся наконт супярэчнасцяў паміж Беларуссю і Расіяй у нафтагазавым пытанні і сельскагаспадарчай сферы. «Я лічу, што ніякіх наступстваў яны (супярэчнасці) не будуць мець, таму што гэта чыста тэхнічныя пытанні. Усё вырашыцца ў рамках таго ж прававога і палітычнага поля, у якім мы сёння жывём. У хуткім часе ўсё гэта будзе прыведзена да лагічнага завяршэння», — адзначыў ён.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Дональд Трамп паабяцаў Кангрэсу «Вялікую Амерыку»

У першым сваім звароце да Кангрэса прэзідэнт ЗША, азначыў асноўныя задачы, якія ён збіраецца вырашыць. Амерыка гатовая выконваць вядучую ролю ў свеце. «Амерыка вялікая», — заявіў ён.

Так, кіраўнік амерыканскай дзяржавы сказаў, што ён будзе прасіць Кангрэс аб самым высокім павелічэнні расходаў на абарону за ўсю гісторыю ЗША. Гаворка ідзе пра 54 мільярды долараў. Каб знайсці гэтыя сродкі, плануецца скарачэнне расходаў іншых міністэрстваў.

Трамп не мае намеру адмаўляцца ад жорсткай пазіцыі ў міграцыйнай палітыцы. Ён пацвердзіў свой намер забараніць уезд у ЗША грамадзянам сямі ісламскіх дзяржаў. Па яго перакананні, мігранты, якія ўязджаюць у краіну, павінны мець магчымасць забяспечыць сябе, а не абцяжарваць дзяржаву. Кіраўнік ЗША анансаваў таксама пачатак будаўніцтва сцяны на мяжы з Мексікай у хуткім часе.

Гаворачы аб асноўных напрамках знешняй палітыкі ЗША, Дональд Трамп заявіў, што гатовы працаваць з саюзнікамі, у тым ліку ў ісламскім свеце, каб знішчыць тэрарыстычную групоўку «Ісламская дзяржава».

Прэзідэнт выказаў гатоўнасць да стварэння новых саюзаў. «Амерыка гатовая знайсці новых сяброў і пачаць новыя партнёрскія адносіны, калі гэта адпавядае агульным інтарэсам», — падкрэсліў Трамп, даўшы пры гэтым зразумець, што мае на ўвазе Расію.

### Еўрапарламент і Савет ЕС узгаднілі ўмовы адмены віз для ўкраінцаў

У выніку перамоваў паміж прадстаўнікамі Еўрапарламента і Савета Еўрасаюза дасягнута дамоўленасць аб умовах бязвізавага рэжыму для грамадзян Украіны. Украінцы атрымаюць магчымасць «прыязджаць у ЕС на 90 дзён у кожны 180-дзённы перыяд з дзелавымі і турыстычнымі мэтамі, а таксама па сямейных справах», паведамляецца на сайце Еўрапарламента. Для ўезду на тэрыторыю ЕС грамадзянам Украіны трэба будзе мець біяметрычныя пашпарты. Украінцы змогуць уязджаць без віз ва ўсе краіны ЕС, выключаючы Ірландыю і Вялікабрытанію. Як і ў выпадку з Грузіяй, бязвізавы рэжым не дае грамадзянам Украіны права на працаўладкаванне ў краінах ЕС.

### Марын Ле Пэн пагражае пазбаўленне парламенцкага імунітэту



На сесіі Еўрапарламента, якая пройдзе сёння ў Бруселі, адбудзецца галасаванне па пытанні пазбаўлення лідара праваэкстрэмісцкай французскай партыі «Народны фронт», кандыдата ў прэзідэнты краіны Марын Ле Пен, дэпутацкай недатыкальнасці.

Парламенцкі камітэт па юрыдычных пытаннях у мінулы аўторак большасцю галасоў ужо прагаласаваў за пазбаўленне Ле Пен парламенцкага імунітэту за тое, што яна размясціла ў сваім Twitter здымкі актаў насілля тэрарыстычнай групоўкі «Ісламская дзяржава». Як правіла, на сесіях звычайна падтрымліваюцца рашэнні камітэтаў.

У Францыі ў дачыненні да Ле Пен пракуратурай горада Нанта вядзецца аналагічнае расследаванне. Лідар «Народнага фронту» выкарыстала імунітэт для адмовы з'явіцца па выкліку пракуратуры.

## УЛАДА НА СУВЯЗІ

**4 сакавіка ва ўсіх рэгіёнах краіны пройдуць рэгулярныя прамыя тэлефонныя лініі з уладамі. Тысячы пытанняў і не менш адказаў. Некаторыя праблемы кіраўнікі вырашаюць, не паклаўшы трубку тэлефона, іншыя бяруць пад уласны кантроль. Самыя набалелыя просьбы звычайна звязаныя з камунальнымі пытаннямі і добраўпарадкаваннем тэрыторый. Пры гэтым расце і колькасць падзяк за праведзеную работу.**

У гэтую суботу з 9.00 да 12.00 задаць свае пытанні і агучыць праблемы можна будзе наступным прадстаўнікам улады:

**Брэсцкі аблвыканкам**
намеснік старшыні КЛЕЦ Андрэй Анатольевіч (80162213121);
**Віцебскі аблвыканкам**
намеснік старшыні АСКЕРКА Віктар Вітальевіч (80212222222);
**Гомельскі аблвыканкам**
намеснік старшыні ГАРБАЧОЎ Уладзімір Уладзіміравіч (80232751237);
**Гродзенскі аблвыканкам**
першы намеснік старшыні ЖУК Іван Алейзавіч (80152735644);
**Магілёўскі аблвыканкам**
намеснік старшыні ХАРЫТОНЧЫК Дзмітрый Іванавіч (80222501869);
**Мінскі аблвыканкам**
першы намеснік старшыні МАКАР Ігар Мікалаевіч (80175004160);
**Мінскі гарвыканкам**
кіраўнік спраў МАЦЕЛЬСКАЯ Ганна Мар'янаўна (80172224444).

■ Геапалітыка



# ВОЙНЫ: КЛАСІЧНЫЯ І НОВЫЯ

**Аперацыя Турцыі на тэрыторыі Сірыі «Шчыт Еўфрата», якая працягвалася больш за паўгода, дасягнула галоўнага поспеху** — буйны горад Эль-Баб з насельніцтвам у сто тысяч чалавек цалкам вызвалены ад тэрарыстаў. Нагадаю, што аперацыя была ўзгоднена з Расіяй, якая дапамагала падтрымкай з паветра ў наступленні турэцкіх войскаў. Цяпер распачата значная работа па ачыстцы горада і наваколля ад мін. Наступнай мэтай турэцкіх войскаў можа стаць горад Мюнбіч. Пасля гэтага плануецца наступленне на Раку. Турцыя спрабуе стварыць зону бяспекі ўздоўж сваёй мяжы і не дазволіць кансалідавацца сілам сірыйскага курдскага апалчэння, якое сімпатызуе забароненай на турэцкай тэрыторыі Рабочай партыі Курдыстана.

**Набірае сілу супрацьстаянне паміж прэзідэнтам ЗША і буйнымі сродкамі масавай інфармацыі**, якія, з яго пункту гледжання, неадэкватна выказваюцца ў дачыненні да яго палітыкі. 24 лютага журналістаў тэлеканала CNN, а таксама такіх буйных газет, як The New York Times, Los Angeles Times і Politico не пусцілі на брыфінг, які праводзіўся ў Белым доме. У знак салідарнасці байкатаваў мерапрыемства рэпарцёр інфармагенцтва Associated Press. Выказала пратэст асацыяцыя карэспандэнтаў Белага дома. Таксама стала вядома, што Трамп не прыме ўдзел у штогадовай вячэры Асацыяцыі карэспандэнтаў Белага дома (WHCA), якая запланавана на 29 красавіка. Апошні раз кіраўнік дзяржавы не ўдзельнічаў у такім мерапрыемстве ў часы Рональда Рэйгана — тады ён быў паранены і ачуньваў. Да супрацьстаяння з прэзідэнтам ахвотна далучыўся і Галівуд. Іранскі фільм «Развод Надэра і Сімін» атрымаў прэмію «Оскар» у намінацыі «Найлепшы фільм на замежнай мове». Разынка ў тым, што рэжысёр фільма Асгар Фархадзі адмовіўся наведваць цырымонію ўручэння прэміі «Оскар» у сувязі з узмацненнем жорсткасці іміграцыйнай палітыкі ў ЗША.

Цалкам магчыма, што многія дастаткова неардынарныя ідэі Дональда Трампа не будуць увасоблены ў жыццё асабліва з-за ўплыву членаў яго сям'і. У прыватнасці, сусветную грамадскасць сур'ёзна хваляваў магчымы выхад ЗША з Парыжскага пагаднення па клімаце. Дональд Трамп неаднаразова заяўляў падчас выбарчай кампаніі, што не верыць ні ў якое пацяпленне і не будзе марнаваць на гэтую лухту грошы ЗША. Асцярогі зразумелыя — пацяпленне ў наяўнасці і можа прынесці свету катастрафічныя наступствы. У Парыжы нарэшце ўдалося ўгаварыць вядучыя краіны свету прызнаць гэты факт і прыняць план барацьбы з небяспечнай кліматычнай з'явай. Выхад ЗША з пагаднення мог бы ўсё разбурыць. Як паведаміла The Wall Street Journal, усё-ткі прэзідэнт ЗША **Дональд Трамп адмовіўся ад ідэі вывесці краіну з Парыжскага пагаднення па клімаце**. Паводле звестак газеты, ключавы ўплыў на гэтае рашэнне аказала пазіцыя яго дачкі Іванкі і зяця Джарэда Кушнера.

**Дыпламатычны скандал разыграўся ў сувязі з забаронай нядаўна выбранага прэзідэнта Малдовы Ігара Дадона** на ўдзел малдаўскіх ваенных у сумесных вучэннях ЗША, Балгарыі, Македоніі, Чарнагорыі, Румыніі, Сербіі, Славеніі і Украіны ў румынскім навучальным цэнтры Смырдан з 20 лютага па 1 сакавіка. У адказ паслы ЗША і Румыніі ў Малдове апублікавалі сумесны зварот, у якім папракнулі прэзідэнта ў недружалюбных паводзінах, а таксама паспагадалі арміі Малдовы, што яна цяпер застанецца непадрыхтаванай. У лісце ў адказ прэзідэнт запатрабаваў ад паслоў спыніць умяшанне ў яго дзейнасць, паколькі Малдова з'яўляецца суверэннай і незалежнай дзяржавай. Ігар Дадон вядомы тым, што ставіць пад сумненне ўдзел краіны ў раней заключаным пагадненні з ЕС аб асацыяцыі і хоча аднавіць сяброўскія адносіны з Расіяй.

Як вядома, пачаўся **візіт прэзідэнта Грузіі Гіоргія Маргвелашвілі ў Беларусь**. Візіту папярэднічала інтэрв'ю Маргвелашвілі для праграмы «Буйным планам» на тэлеканале «Беларусь 1». Прэзідэнт Грузіі адзначыў, што адносіны паміж нашымі краінамі, якія маюць велізарны патэнцыял, набылі новы імпульс. Асаблівае значэнне для Грузіі мае выкарыстанне беларускага вопыту ў сваёй эканоміцы для аднаўлення сельскай гаспадаркі. Сапраўды, адмоўнае сальда знешняга гандлю па выніках 2016 года ў Грузіі склала 7 мільярдаў 738 мільёнаў долараў, пры тым, што ўвесь аб'ём знешняга гандлю складае ўсяго толькі 11 мільярдаў 966 мільёнаў долараў. І імпарт прадуктаў харчавання ўносіць сур'ёзны негатыў у працэс знешняга гандлю. Таксама Гіоргій Маргвелашвілі адзначыў, што Беларусь і Грузія з'яўляюцца лагістычнымі хабамі паміж Захадам і Усходам, таму ў гэтым кірунку трэба думаць і развіваць магчымасці. І гэтаму не супярэчаць накіраванасць Беларусі на еўразійскую інтэграцыю, а Грузіі — на еўрапейскую.

**Сяргей КІЗІМА, доктар палітычных навук**

■ Форум

# СФЕРА ЎЗАЕМНЫХ ІНТАРЭСАЎ

## Прапановы ўлады і бізнесу ў многім супадаюць

**XVIII Асамблея дзелавых колаў «Ад узаемаразумення да ўзаемадзеяння», якая адбылася ўчора ў Мінску, стала цэнтральным мерапрыемствам II Тыдня беларускага прадпрымальніцтва. Удзельнікам асамблеі быў прадстаўлены праект Нацыянальнай платформы бізнесу — 2017. Пасля абмеркавання канчатковы тэкст, падрыхтаваны з улікам прапаноў удзельнікаў мерапрыемства, будзе накіраваны Прэзідэнту, кіраўніцтву Савета Міністраў і Адміністрацыі Прэзідэнта, службовым асобам усіх міністэрстваў і ведамстваў.**


Фота БЕЛТА.

### Палёгка для прадпрымальнікаў — ужо ў сакавіку

**Міністр эканомікі Беларусі Уладзімір ЗІНОЎСКІ** перад пачаткам асамблеі паведаміў, што рабочая група па стымуляванні дзелавой актыўнасці, выключэнні залішніх патрабаванняў да суб'ектаў гаспадарання, удасканаленні кантрольна-наглядный дзейнасці сфармулюе свае прапановы да канца сакавіка. «Зусім нядаўна кіраўнік дзяржавы паставіў задачу па спрашчэнні адміністрацыйных працэдур для бізнесу. Створана рабочая група, якую ўзначальвае кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля Качанава. Ідзе інтэнсіўная работа. На працягу месяца рабочая група павінна прадставіць на разгляд кіраўніка дзяржавы нарматыўны акт, дзе будзе адлюстравана, як, якім чынам і што мы будзем мяняць», — адзначыў міністр. Уладзімір Зіноўскі назваў тры асноўныя задачы, якія стаяць перад рабочай групай. Гэта скарачэнне адміністрацыйнай нагрузкі на бізнес, прымяненне заканадаўства па дэкрыміналізацыі эканамічных рызык, адэкватнасць пакарання неправамерных дзеянняў, якія здзяйсняе бізнес. «Добра, што ў склад рабочай групы ўваходзяць кіраўнікі многіх органаў дзяржаўнага кіравання і бізнес-саюзаў. Гэта важна для адпрацоўкі дакумента», — сказаў Уладзімір Зіноўскі.

«Залішнія праверкі, якія прыводзяць да дрэнных наступстваў, не даюць нармальна працаваць бізнесу, павінны быць выключаны. Любая праверка, на наш погляд, павінна папярэджваць парушэнні, а не біць, як кажуць у народзе, па хвастах, калі ўжо адміністрацыйнае парушэнне здзейснена», — сказаў Уладзімір Зіноўскі. Ён вітаў адмену праверачнай дзейнасці бізнесу Міністэрствам па надзвычайных сітуацыях. «Гэта вельмі добры крок, тым больш што адказнасць усё роўна нясе бізнес», — падкрэсліў міністр. Паводле яго слоў, Міністэрства аховы здароўя таксама ідзе насустрач, ужо скарочаны патрабаванні да прадпрыемстваў грамадскага харчавання. Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю ўвяло мараторый на праверкі гандлёвай інспекцыяй.

### Бізнес выслухаюць і пачуюць

Міністр эканомікі паабяцаў, што ніводная прапанова Нацыянальнай платформы бізнесу —2017 не застанецца без увагі дзяржорганаў. «Усе ідзі, што прапанаваны ў гэтай платформе, знойдуць свайго гаспадара ў асобе рэгулятара ці галіновага дзяржаўнага органа — мы выбудоўваем матрыцу, у якой прапісаны і адказныя, і тэрміны. Будуць прыкладзены ўсе намаганні, каб сёлета па-за ўвагай не засталася ніводная прапанова бізнесу, якая змяшчаецца ў платформе», — сказаў ён.

Многія прапановы Нацыянальнай платформы бізнесу супалі з мерамі, якія запланаваў рэалізаваць урад і Нацыянальны банк. «Гэта сведчыць аб тым, што мы — Мінэканомікі, органы-рэгулятары ва ўсіх адчувальных для бізнесу пытаннях — з аднаго боку, і сам бізнес — з другога, у цэлым глядзім у адным напрамку», — канстатаваў міністр. Уладзімір Зіноўскі падкрэсліў, што Нацыянальная платформа бізнесу — 2017 — асаблівая, бо кожная прапанова была абмеркавана на грамадска-кансультацыйных саветах дзяржаўных органаў, адказных за рэалізацыю рэгулярнай палітыкі ў адпаведнай сферы дзейнасці. «Мінэканомікі прымала ўдзел у рабоце над платформай з самага пачатку», — дадаў ён.

### Аб аздараўленні прадпрыемстваў, інфляцыі і субсідыях

**Намеснік міністра эканомікі Ірына КАСЦЕВІЧ** паведаміла, што на разгляд дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў унесены праект закона «Аб неплацежаздольнасці і банкруцтве». У прыватнасці, ён накіраваны на стварэнне ўмоў для рэструктурызацыі і аздараўлення прадпрыемстваў альбо кіраванай ліквідацыі праблемных прадпрыемстваў, павышэння гарантый вяртання інвестыцый. «Зараз дакумент рыхтуецца да першага чытання, і мы спадзяёмся, што па выніках двух чытанняў краіна атрымае закон аб банкруцтве, які будзе адпавядаць усім перадавым сусветным практыкам», — падкрэсліла намеснік міністра.

Ірына Касцевіч адзначыла, што ў Беларусі выпрацаваны новыя інструменты і механізмы рэалізацыі эканамічнай палітыкі на пяцігодку. «У першую чаргу гаворка ідзе аб павышэнні эфектыўнасці кіравання эканомікай — аптымізацыі колькасці і функцый дзяржаўнага апарату, стварэнні «кампактнага» ўрада, удасканаленні адносін уласнасці», — растлумачыла яна.

Паводле яе слоў, другім напрамкам стане разняволенне дзелавой ініцыятывы, удасканаленне кантрольнай дзейнасці і стварэнне рэальных умоў па паляпшэнні вядзення бізнесу. Трэці напрамак — зніжэнне ставак па крэдытах банкаў у звязцы са зніжэннем інфляцыі ў эканоміцы да канца 2020 года да 5%. «Гэта акажа стымулюючы ўплыў не толькі на інвестыцыйную актыўнасць, але і на фінансавы стан арганізацый. Стаўка рэфінансавання да 2020 года складзе 7—9% гадавых, стаўка па новых крэдытах банкаў у нацыянальнай валюце складзе 9—11% гадавых», — прагназуе намеснік міністра.

Чацвёртым напрамкам Ірына Касцевіч назвала стварэнне паўнавартаснага фінансавага рынку з новымі магчымасцямі для фінансавання — карпарацыйныя аблігацыі, праектнае крэдытаванне, размяшчэнне акцый на міжнародных фондавых біржах пры дапамозе замежных дэпазітарных распісак.

**Міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю Уладзімір КАЛТОВІЧ** паведаміў прысутным, што адна з глабальных задач эканомікі — ліквідацыя перакрыжаванага субсідзіравання. Перакрыжаванае субсідзіраванне — сітуацыя, пры якой у мэтах абароны грамадзян тарыфы на камунальныя паслугі для насельніцтва вызначаюцца ў паніжаным памеры. Фінансавая нагрузка па субсідзіраванні насельніцтва перакладаецца на прадпрыемствы, рэальны сектар эканомікі. Міністр лічыць, што гэта не зусім сучасны падыход у эканоміцы.

На мерапрыемстве таксама абмяркоўваліся прыярытэтныя напрамкі ўдасканалення дзелавога клімату Беларусі, паляпшэнне пазіцыі краіны ў міжнародных рэйтынгах, асноўныя выклікі для эканомікі і прадпрымальніцтва ў 2017 годзе, павышэнне эфектыўнасці дыялогу бізнесу і ўлады, дынаміка лічбавай трансфармацыі эканомікі і іншыя актуальныя пытанні.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

# «І ўсім расказваю, што гэта... выгадна»


Фота Надзеі БУЖАН.

Не ведаю, як іншым, а мне ў маім паўсядзённым жыцці не хапае шмат чаго і, у прыватнасці, беларускай мовы. Яе, нашу родную, рэдка пачуеш ад людзей на вуліцы, рэдка — па тэлебачанні. І дзякуй богу яшчэ, што ёсць у краіне штодзённая беларускамоўная газета, што ёсць калектыў журналістаў, якія ведаюць і любяць яе — мілагучную, непаўторную, незаменную, што яны пішуць на ёй, прычым — пра ўсё. Я, напрыклад, з цікавасцю чытаю звяздоўскую «Сямейную газету» і «Чырвоную змену» (яе, дарэчы, з далёкіх юнацкіх гадоў). Шмат розных тэм (і на канкрэтных прыкладах, з розных рэгіёнаў) асвятляецца ў «Мясцовым самакіраванні», у выпусках «Саюз-Еўразія»...

Але ж галоўнае, што, чытаючы «Звязду» — яе «Жырандолю», «Ігуменскі тракт» ды іншыя тэматычныя старонкі і рубрыкі, — я маю шанц ці не штодня пераконвацца ў тым, якая багатая і цікавая ў нас гісторыя, якая культура і мова, а ўжо людзі... Колькі слаўных сыноў і дачок, колькі рэдкіх асоб, колькі сапраўдных талентаў!

І «Звязда» — што, вядома ж, важна — не проста заўважае іх, але і... гадуе: рыхтуе будучых журналістаў, пісьменнікаў, дапамагае чытачам вырашаць праблемы, з увагай ставіцца да клопатаў і прапаноў, урэшце — да творчасці. Я, напрыклад, часта дасылаю свае допісы ў любімыя рубрыкі «Зваротная сувязь», "Хто каго?», «Алё, народ на провадзе!», часам, бывае, друкуюся, што, вядома ж, прыемна і мне, і блізкім.

У прыватнасці, падпіску на «Звязду» на першы квартал гэтага года я выйграў у конкурсе "Хто каго?" (на лепшы подпіс да здымка). Потым, як заўсёды, не паленаваўся — даслаў у рэдакцыю купон на розыгрыш прызоў. І што вы думаеце? Выйграў мабільнік! Цяпер з задавальненнем карыстаюся ім і ўсім кажу, што чытаць «Звязду» не толькі цікава, але і выгадна.

**Валерый ГАЎРЫШ,** *г. Чавусы*

## 20 ДЗЁН ДЭКРЭТНАГА ВОДПУСКУ ДЛЯ МУЖЧЫН?

**У гэтым годзе рабочая група, у якую ўвойдуць спецыялісты розных ведамстваў, вывучыць пытанне мэтазгоднасці ўвядзення ў Беларусі абавязковага сацыяльнага водпуску для бацькаў пры нараджэнні дзіцяці. Магчыма, гэтае пытанне будзе вынесена і на грамадскае абмеркаванне — гэтага не выключыў віцэ-прэм'ер Беларусі Васіль ЖАРКО ў інтэрв'ю часопісу «Беларуская думка».**



Згодна з нашым заканадаўствам любы з бацькоў можа аформіць водпуск па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім узросту трох гадоў. Беларускія мужчыны пакуль гэтым правам карыстаюцца вельмі рэдка (толькі 1% мужчын прымаюць рашэнне ўзяць дэкрэтны адпачынак замест маці дзіцяці). Аднак у апошнія некалькі гадоў іх цікавасць да гэтага стала расці.

Зараз у падпраграме «Сям'я і дзяцінства» Дзяржаўнай праграмы «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека Рэспублікі Беларусь» на 2016—2020 гады сфармулявана заканадаўчая ініцыятыва: абавязаць мужчын знаходзіцца ў дэкрэтным водпуску не менш за 20 дзён. Мэтазгоднасць дадзенай ініцыятывы і будзе разглядацца рабочай групай.

**Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by*

## ДЫЯЛОГ ПА КУРАПАТАХ БУДЗЕ ПРАЦЯГНУТЫ

### Пра гэта заявіў старшыня Мінгарвыканкама Андрэй Шорац

**Як перадае БЕЛТА са спасылкай на сайт Мінгарвыканкама, кіраўнік горада заклікаў штучна не напружваць атмасферу вакол будаўніцтва бізнес-цэнтра непадалёк ад урочышча Курапаты. Гэта тэма ўзнімалася падчас прыёму грамадзян, куды прыйшлі актывісты, якія выступаюць супраць узвядзення будынка.**

— Мы вас пачулі. Правядзём кансультацыі з Міністэрствам культуры, іншымі арганізацыямі, навукоўцамі, — паабяцаў Андрэй Шорац.

Раней прадстаўнікі гарадскіх улад і Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі канстатавалі, што на тэрыторыі забудовы няма месцаў пахавання ахвяр рэпрэсій, з гэтай высновай пагадзіліся ўсе ўдзельнікі сустрэчы.

Днём раней падчас прэс-канферэнцыі да 100-годдзя міліцыі па гэтую тэму выказаўся і **міністр унутраных спраў Ігар ШУНЕВІЧ.**

— Я ведаю, што існуе праблема. З аднаго боку, там ідзе легальнае, абсалютна законнае будаўніцтва, з другога боку — існуе меркаванне пэўнай групы людзей, што будоўлі там быць не павінна. МУС менш за ўсё хацела б выступаць трацейскім суддзёй у гэтым пытанні. Калі будзе прынята рашэнне аб спыненні будаўніцтва, пытанне такім чынам вырашыцца. Калі не — мы будзем выконваць закон, алгарытм нашых дзеянняў вядомы. У цэлым хацелася б меншага градуса вастрыні, — падагульніў кіраўнік міліцэйскага ведамства.

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*

■ Здарэнні

## НА ТЫМ ЖА МЕСЦЫ Ў ТОЙ ЖА ЧАС

...падсцерагала бяда сына і маці ў Альшанах Столінскага раёна. 37-гадовы мужчына трапіў пад колы машыны на вуліцы Школьнай насупраць дома №64. Жыхар вёскі атрымаў траўмы і быў дастаўлены ў бальніцу. Роўна праз пяць дзён, 27 лютага, на гэтым жа месцы машына збіла 74-гадовую маці пацярпелага. У ДТЗ жанчына атрымала цяжкія траўмы.

Як паведамілі ў абласным упраўленні ДАІ, кіроўца, які наехаў на мужчыну, сем разоў раней прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці, а той, што збіў пенсіянерку, — 91 раз.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

■ Не сезон

## АДПАЧЫНАК ДЛЯ «РЭГУЛЯТАРА»

**Лавіць шчупака ў Беларусі забаронена з 1 сакавіка па 15 красавіка, а ў Віцебскай вобласці — з 9 сакавіка па 25 красавіка. У гэты перыяд у яго праходзіць нераст.**

Па тэрмінах сярод рыб краіны шчупак апярэджвае ўсіх — нерастуе ў сакавіку-красавіку. У паўднёвых раёнах пачынае на 10—15 дзён раней, чым у паўночных, у азёрах — пазней, чым у рэках. Тэрміны і працягласць нерасту залежаць ад кліматычных умоў і ў першую чаргу ад прагрэву вады. Разгарназіраецца пры тэмпературы 5—7 градусаў. Шчупак — гэта свайго роду рэгулятар. Ён знішчае малакаштоўную дробязь, хворых і аслабленых рыб і спрыяе тым самым лепшаму росту каштоўных відаў рыб і аздараўленню іх папуляцый.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# АД СЛОЎ ДА СПРАВЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Асабліва актыўна мінулай восенню абмяркоўвалі тэму прыбірання пад'ездаў. Прадпрыемствы ЖКГ выбіралі выканаўцаў для гэтай працы на тэндарнай аснове, прычым асноўным крытэрыем была нізкая цана. У выніку на многіх участках перамаглі прыватныя кампаніі, якія прапанавалі крыху больш нізкую цану, чым ЖЭУ. Аднак, паколькі да рэформы ў іх практычна не было магчымасці паспрабаваць сябе на гэтай ніве, адпаведным вопытам яны не валодалі. Так што некаторыя кампаніі, адразу ўзяўшы на сябе занадта вялікія аб'ёмы работы, аб'ектыўна не змаглі з імі справіцца.

Гэта той выпадак, калі першы блін сабаку. Усё ж такі наяўнасць рэальных канкурэнтаў стымулюе і дзяржаўныя арганізацыі, і прыватныя кампаніі «трымаць сябе ў тонусе», што павінна цягнуць за сабой толькі плюсы для жыхароў: больш высокая якасць паслуг за меншы кошт. Праўда, жыхароў у гэтым выпадку не спыталі, чаго яны ў сапраўднасці хочуць. Маўляў, жыхары абавязкі па ўтрыманні агульных тэрыторый перадаюць ЖКГ, а значыць, прадпрыемствы самі маюць права прымаць рашэнні па шматлікіх пытаннях. І быццам бы робяць усё «на карысць», але адчуванне непаразумення: «а чаму нас не спыталі?» застаецца. Гэта пры тым, што большасць жыхароў нават не заўважылі якіх-небудзь перамен, хіба што форма на тых, хто наводзіць парадак у пад'ездах, змянілася.

Але калі аб тым, каму лепш даручыць прыбіранне, у жыхароў не спыталі, то магчымасць пракантраляваць вынікі далі. Цяпер кожны раз пасля заканчэння працы чалавек, пасаду якога часам называюць модным словам «клінер», павінен звярнуцца да жыхара пад'езда, каб той сваім подпісам пацвердзіў добрасумленнае выкананне абавязкаў. Так, гучыць цалкам разумна, але сціпласць нашага народа часта не ідзе яму на карысць, і гэта якраз той выпадак. Сама некалькі разоў трапляла ў сітуацыю, калі прыбіральшчык, знаёмы чалавек, з якім вітаешся пры сустрэчы і нават можаш абмеркаваць надвор'е, просіць распісацца ў паперах яшчэ да выканання работы, «а то потым будзе цяжка кагосьці вылавіць». Ці з той жа просьбай чакае каля ўваходу, хоць ты яшчэ толькі накіроўваешся дадому і ў вочы не бачыў выніку яго працы. І ўсё роўна не адмаўляеш, хутка, нібы здзяйсняючы дробнае хуліганства, ставіш подпіс, бо сорамна сумнявацца ў чыіхсьці прафесійных заслугах. Змагацца ў першую чаргу трэба нават не з няякасным выкананнем абавязкаў наёмнымі работнікамі, а са схаванай за сціпласцю абыякавасцю саміх жыхароў.




**Да і пасля. Прыклад справаздачы аб праведзенай рабоце на партале 115.бел.**

Калі выказаць прэтэнзіі ў вочы гатовыя нямногія, то на прасторах інтэрнэту або ў тэлефонных размовах мінчане адчуваюць сябе значна вальней. Пра гэта сведчыць вопыт работы адзінай дыспетчарскай службы і Кантакт-цэнтра горада Мінска. Даволі хутка кароткі нумар 115 ператварыўся ў намінальны, стаўшы практычна нароўні з тэлефонамі медыцынскай дапамогі і міліцыі. У цэнтры нават падлічылі, што агульная працягласць усіх тэлефонных размоў за мінулы год склала больш як сем гадоў. Любыя праблемы, звязаныя з гарадской гаспадаркай, — «тэлефаную на 115».

Гэта сапраўды выдатна, таму што ў сучасных рэаліях для многіх цана часу стала вельмі высокай. І калі для таго, каб вырашыць найпрасцейшую праблему, давялося б ператэлефанаваць па пяці нумарах, як гэта часта бывала раней, то многія проста вырашылі б, што яна не такая істотная і цалкам можа застацца па-за ўвагай. З парталам 115.бел яшчэ прасцей: нікому асабіста нічога тлумачыць не трэба, пісьмова сфармуляваў сутнасць праблемы, для большай пераканаўчасці прадставіў фотадоказ і ў любы зручны час правярай статус яе рашэння. На сайце ўжо зарэгістравана больш за 33 тысячы чалавек. Праз некаторы час пасля ўвядзення ў дзеянне самога партала на ім з'явіўся рэйтынг найлепшых раёнаў горада і найлепшых арганізацый, заснаваны на колькасці вырашаных праблем і ацэнцы якасці работы карыстальнікамі, хоць у ідэале трэба было б улічваць і колькасць праблем, якія ўзнікаюць, — усё ж такі яна павінна зводзіцца да мінімуму.

Праўда, ёсць арганізацыі, колькасць нявырашаных праблем на рахунку якіх перавальвае за сотню. І нічога, працягваюць працаваць. Магчыма, за гэта варта караць не толькі нямым усеагульным дакорам, але і больш дзейснымі спосабамі.

Адно можна сказаць дакладна: сістэма ЖКГ, па меншай меры з пункту гледжання вырашэння праблем, стала значна прасцейшай і бліжэйшай да народа. На гэта накіравана і стварэнне адзінага разлікова-даведачнага цэнтра і адзінай аварыйнай службы. У цэлым слова «адзіны» можна назваць ключавым ва ўсёй рэформе, і гэта, як сінонім «спрашчэння», не можа не радаваць. Наогул тое, што адбываецца цяпер, яшчэ некалькі гадоў таму больш нагадвала б цуд: пару секундных клікаў у мабільнай праграме — і праблема пачынае вырашацца. Ці то яшчэ будзе...

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*


## ОБЪЯВЛЕНИЕ о торгах

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание), местонахождение и стоимость имущества** | Лот №1<br>Станок ребровогорбыльный ГР-500 Ар (РФ) 2011 г. в., начальная цена 1149,44 рубля;<br>Лот №2<br>Станок двухпильный кромкообрезной ЦОД 450, 2011 г. в., начальная цена 1092,56 рубля;<br>Лот №3<br>Станок ленточнопильный LT 20 BIE 15 SMH 2010 г. в. (Польша), начальная цена 9914,56 рубля;<br>Лот №4<br>Станок ленточнопильный LT 20 BIE 15 SMH 2011 г. в. (Польша), начальная цена 9914,56 рубля;<br>Лот №5<br>Станок четырехсторонний продольно-фрезеровочный мод-G 240/5, 2013 г. в. (Италия), начальная цена 42216,48 рубля;<br>Лот №6<br>Станок ленточнопильный LT 20 BIE 15 SMH 2011 г. в., начальная цена 9914,56 рубля (Польша) |
| **Собственник (владелец) имущества** | СООО «Иск Поиск» |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | Витебская обл., г. п. Шумилино, ул. Северная, 9 |
| **Информация об обременениях** | Залог ОАО «АСБ Беларусбанк» |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | 14.03.2017 в 11.00,<br>г. п. Шумилино, ул. Вокзальная, 3 |
| **Справочная информация** | Отдел принудительного исполнения Шумилинского района, 211259, г. п. Шумилино, ул. Вокзальная, 3<br>Судебный исполнитель – Скоринова Светлана Александровна, тел. (02130) 4 15 46<br>Начальник отдела – Гимбицкая Елена Константиновна, тел. (02130) 5 15 69 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет отдела принудительного исполнения Шумилиснкого района: ф-л 200 ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка 635, р/с 3642903005033, УНН 300002505, не позднее 10.03.2017<br>Минимальная величина первого шага – 5% от стоимости каждого лота.<br>В соответствии со ст. 516 ГПК Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги |

| ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА | | | |
|---|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки»,<br>г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 | | |
| **Продавец** | ОАО «Минский комбинат хлебопродуктов»,<br>г. Минск, ул. Слесарная, 48 | | |
| **Предмет аукциона** | | | |
| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер |
| **Магазин №7** | Здание специализированное организаций оптовой торговли, материально-технического снабжения и сбыта продукции | 98,8 кв. м | 601/С-13258 |
| ***Составные части и принадлежности***: сарай | | | |
| ***Адрес:*** Минская обл., Логойский р-н, Острошицкий с/с, д. Бояры, ул. Центральная, д. 12 | | | |
| ***Сведения о земельном участке:*** пл. 0,0851 (га), предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания здания магазина №7. Ограничения: охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 В, пл. 0,005 га | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 31 357 руб. 25 коп. (снижена на 20%)** | | | |
| **Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с № 3012343260010 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи:** | **15** рабочих дней после проведения аукциона | | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, условия оплаты предмета аукциона, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by | | | |
| Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 12.01.2017 г. | | | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия | | | |
| **Дата и время проведения аукциона** | **23.03.2017 г.** в 14.00 по адресу:<br>**г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703,<br>ЗАО «Центр промышленной оценки»** | | |
| **Дата и время окончания приема документов** | **22.03.2017 г.** до 17.00 по адресу:<br>**г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703,<br>ЗАО «Центр промышленной оценки»** | | |
| **Контактные телефоны** | +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42.<br>Email: auction@cpo.by | | |

Уважаемые акционеры

## ОАО «Электроремонтный завод»

**30 марта 2017 года в 13.00**

состоится очередное общее собрание акционеров ОАО «Электроремонтный завод».

Собрание пройдет по адресу: г. Минск, промузел Колядичи, ул. Бабушкина, 19, 3-й этаж, зал заседаний.

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

1. О финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2016 год и основных направлениях деятельности Общества на 2017 год.
Докладчик – директор Общества.
2. Отчет о работе наблюдательного совета в 2016 году.
Докладчик – председатель наблюдательного совета Общества.
3. О результатах аудиторской проверки и проверки ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2016 год.
Докладчик – председатель ревизионной комиссии Общества.
4. Утверждение бухгалтерского баланса Общества, отчета о прибылях и убытках.
Докладчик – главный бухгалтер Общества.
5. О распределении прибыли и убытков, выплате дивидендов за 2016 год.
Докладчик – главный бухгалтер Общества.
6. Утверждение направлений использования прибыли, остающейся в распоряжении Общества (после уплаты налогов, сборов (пошлин, других обязательных платежей) на 2017 год и 1 квартал 2018 года. Периодичность выплаты дивидендов за 2017 год.
Докладчик – главный бухгалтер Общества.
7. Избрание членов наблюдательного совета.
8. Избрание членов ревизионной комиссии.
9. О размерах вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества за осуществление возлагаемых на них обязанностей.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 19 (приемная директора, 3-й этаж) с 09.03.2017 г. по 29.03.2017 г. (время работы с 12.00 до 15.00) в рабочие дни понедельник–четверг и в день проведения собрания 30.03.2017 г. с 11.00 до 12.30.

Регистрация участников собрания **30 марта 2017 года с 11.00 до 12.30** по месту проведения собрания.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра акционеров на 1 марта 2017 года.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру общества – паспорт, представителю акционера и юридическим лицам – паспорт и доверенность.

УНП 100008169

Утерянные представительством Белгосстраха по Партизанскому району г. Минска бланки страховых полисов по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории государств-членов системы «Зеленая карта» серии BY01 №12454149, 12454151 **считать недействительными.**

УНП 100122726

Утерянный представительством Белгосстраха по Московскому району г. Минска бланк страхового полиса по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БЛБ №0534319 **считать недействительным.**

УНП 100122726

В суд Пинского района города Пинска Брестской области поступило заявление об объявлении умершим гражданина Кулеша Владимира Павловича, 1966 года рождения, проживавшего в г. Пинск, ул. Ленинградская, д. 11, кв. 7 и в 1999 году убывшего в РФ на заработки, связь с ним утрачена в 1999 году.

Просьба к гражданам и юридическим лицам, имеющим сведения о гражданине Кулеше В. П., сообщить об этом в течение двух месяцев с момента публикации в суд Пинского района и города Пинска, расположенный по адресу: 225710, Брестская область, г. Пинск, ул. Пушкина, 14.

1СУ «Квитанция о приеме наличных денежных средств (страховых взносов)» серии КС №1684754 в количестве 1 штуки в Представительстве Белгосстраха по Слуцкому району считать недействительным.

УНП 600013344

## ОТЧЕТ

УНП 790613262

о деятельности фонда «Почет и память» за 2016 год

1. Учредитель фонда – 1 человек.
2. Имущество, переданное учредителем, – 2 100 р.
3. Благотворительные взносы – 6 049,99 р.
4. Доход, полученный от деятельности фонда в соответствии с Уставом, – 300 р.
5. Общая сумма расходов на достижение целей, указанных в Уставе, – 7 732,51 р.
6. На балансе фонда «Почет и память» на 1.01.2017 г. числится постамент под бюст из гранита стоимостью 3 000 р.
7. Остаток денежных средств на расчетном счете на 1.01.2017 г. – 805,52 р.

***Уважаемые акционеры***

## *ОАО «Рапс»*

**24 марта 2017 года**

состоится очередное общее собрание акционеров **ОАО «Рапс»,** расположенного по адресу: Минская обл., Минский район, 223014, аг. Крупица.

*Собрание пройдет по адресу: Минская обл., Минский район, аг. Крупица, ул. Садовая, д. 20, административное здание ОАО «Рапс», 1-й этаж, актовый зал.*

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

1. Отчет о работе наблюдательного совета в 2016 году.
2. О финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2016 году и основных направлениях деятельности Общества на 2017 год.
3. О результатах аудиторской проверки и проверки ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2016 год.
4. Утверждение годового отчета и баланса Общества.
5. О распределении прибыли, остающейся в распоряжении предприятия (покрытии убытков), и выплате дивидендов за 2016 год. Утверждение направлений использования прибыли, остающейся в распоряжении предприятия на 2017 год и 1-й квартал 2018 года.
6. Об избрании членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
7. Утверждение размера вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
8. Об утверждении в новой редакции регламента работы Общества с реестром владельцев ценных бумаг.

*С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: Минская обл., Минский район, аг. Крупица, ул. Садовая, 20, с 15 марта 2017 по 24 марта 2017 года (время работы с 14.00 до 16.00) в кабинете бухгалтерии либо 24 марта 2017 г. по месту проведения собрания.*

Регистрация участников собрания с 10.00 до 11.00 по месту проведения собрания.

**Начало работы собрания – 24 марта 2017 г. в 11.00.**

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 2 марта 2017 года.

**Для регистрации при себе иметь следующие документы:**

**акционеру общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность, заверенную в установленном порядке.**

*Справки по тел.: 8(017) 5069414, 8(017) 5069211.*

УНП 600068480

## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

извещает о проведении повторного открытого аукциона со снижением цены по продаже изолированного помещения по адресу: г. Минск, ул. Радиальная, 11А-5

| ОПИСАНИЕ |
|---|
| **Лот №1:** Изолированное помещение по адресу: г. Минск, ул. Радиальная, 11А-5. Инв. №500/D-708145688. Общая площадь – 1164,6 кв. м. Год постройки – 1977. Начальная цена продажи – 772 740,00 бел. руб. Задаток – 77 200,00 бел.руб. Примечания: 1-й этаж, антресоль. Аренда. Часть изолированного помещения сдается по договору аренды: 844,0 кв. м до 31.12.2018 |
| УСЛОВИЯ |
| 1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником, и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) (Претендент на покупку), обязан оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе Объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола аукциона.<br>2. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.<br>3. Переход права собственности на приобретенный на аукционе Объект недвижимости, имущество должника осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.<br>4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона |
| **Аукцион состоится 05.04.2017 в 11.00 по адресу:<br>г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5%** |
| Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.<br>Задаток перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк», 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже изолир. помещения (Лот №1), проводимом 5 апреля 2017 г.<br>Организация и проведение аукциона осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.<br>Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 6. Окончание приема заявлений и задатков – 03.04.2017 в 11.00.<br>Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом аукциона. Контактное лицо для осмотра Объекта Шабан Денис Иванович (029) 656 80 85.<br>Организатор аукциона вправе снять лот с торгов по письменному указанию подразделения Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь в любое время до объявления его проданным |
| **☎ Организатор аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 550-09-52, 8 (029) 356-90-03 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by** |

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
2 САКАВІКА 2017 г.
ЧАЦВЕР
№ 5 (15812)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

## Марына ЗУЕВА:

# «Сіл надаюць успаміны аб перамогах»

**Марына ЗУЕВА сёння з'яўляецца самай паспяховай і перспектыўнай канькабежкай краіны. На рахунку 24-гадовай мінчанкі ўжо мноства рэкордаў Беларусі і бліскучыя выступленні на міжнародных турнірах. На адным з першых стартаў гэтага года — Сусветнай Універсіядзе ў Казахстане, Марына заваявала дзве залатыя ўзнагароды і адразу пасля гэтага адправілася ў Паўднёвую Карэю, дзе менш чым праз год пройдуць зімовыя Алімпійскія гульні. Там, на чэмпіянаце свету на асобных дыстанцыях, беларуска палепшыла свае ўласныя паказчыкі і ўмацавалася ў сусветнай эліце канькабежнага спорту.**



У перапынку паміж напружанымі трэніроўкамі Марына дала такое рэдкае для сябе інтэрв'ю, у якім расказала, чаму не вельмі любіць размаўляць з журналістамі, як гэта — увесь час знаходзіцца ў мужчынскім калектыве, і колькі тысяч кіламетраў за год яна праязджае на веласіпедзе.

***— Марына, пачнём з нядаўняга паспяховага для цябе старту. На Універсіядзе ў Алматы чакала такога добрага выступлення?***

— Я засталася задаволеная сабой і вельмі радавалася вынікам. Найперш таму, што спраўдзілася ўсё тое, што мы задумвалі з трэнерам. Ведала сапернiц, іх лепшыя вынікі, таму спакойна змагла размеркаваць свае сілы так, каб быць сярод першых. Мела ўпэўненасць у сабе, але ў той жа час ніякай недаацэнкі сапернiц не было.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Знайсці сябе

# ДЫПЛОМ ГАРАНТЫЙ НЕ ДАЕ

## ЯК ВЫПУСКНІКАМ АДШУКАЦЬ «СВАЮ» ПРАФЕСІЮ І БЫЦЬ ЗАПАТРАБАВАНЫМІ?

**На адну вакансію для маладых спецыялістаў сёння ў сярэднім прыпадае 44 рэзюмэ. Летась гэтая лічба была яшчэ большая — на жаданае працоўнае месца ў катэгорыі «пачатак кар'еры» прэтэндавалі 50 чалавек. Аднак сёлета са сцен ВНУ выйдуць «падвоеныя выпускі» — чатыры гады таму навучальныя праграмы на многіх спецыяльнасцях былі скарочаны. Як жа знайсці сабе першае працоўнае месца ва ўмовах невысокага попыту на работнікаў і жорсткай канкурэнцыі? Свае парады выпускнікам 2017 года і цяперашнім студэнтам на Кар'ерным форуме БДУ давалі эксперты ў сферы HR і кіраўнікі вядучых кампаній.**

### Найперш — аналіз рынку

У структуры ўсіх заявак па краіне катэгорыя «пачатак кар'еры» (студэнты або спецыялісты з працоўным досведам ад года да двух) знаходзіцца толькі на дзявятым месцы па цікаўнасці з боку работадаўцаў. Тут размешчана ўсяго 6 працэнтаў вакансій (826 у лічбавым выражэнні), адзначае **дырэктар сайта Работа.tut.by Святлана ШАПАРАВА.** У той жа час па колькасці рэзюмэ, апублікаваных на сайце, маладыя спецыялісты лідзіруюць з велізарным адрывам — 23,9 працэнта (36 584 чалавекі) ад агульнай колькасці.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)*



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Практычная навука

# «Граблі» для... лесу

## І што такое мульчыравальнік?

**Аспірант кафедры лясных машын і тэхналогій лесанарыхтоўкі Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта Дзяніс КАНАНОВІЧ з дзяцінства цікавіўся тэхнікай. Нядзіўна — хлопец нарадзіўся і жыве ў аграгарадку Слабада, што пад Мінскам, а яго бацька працаваў кіроўцам, таму будучы навуковец нярэдка дапамагаў яму ў рамонце аўтамабіляў. Цяпер хобі стала прафесіяй — Дзяніс прымае ўдзел у распрацоўцы тэхнічнага абсталявання, якое выкарыстоўваюць беларускія лесаводы. Галоўная адзнака працы — стыпендыя Прэзідэнта, якую хлопец будзе атрымліваць на працягу года.**



Фота Надзеі БУЖАН.

— Пасля школы я паступіў у БДТУ на спецыяльнасць «Машыны і абсталяванне ляснога комплексу», — расказвае Дзяніс. — Хацелася займацца нечым, звязаным з тэхнікай, і гэты варыянт мне ўпадабаўся. Вучыцца было цікава, я адразу зразумеў, што зрабіў правільны выбар, асабліва калі на трэцім курсе з'явіліся профільныя прадметы і мы пачалі вывучаць спецыялізаваныя машыны: харвестары, фарвадары... Пасля пяці гадоў вучобы большасць аднакурснікаў накіравалася на машынабудаўнічыя прадпрыемствы ці ў лягасы працаваць механікамі, мне ж загадчык кафедры прапанаваў пайсці ў магістратуру і звязаць сваё жыццё з навукай. Я амаль адразу пагадзіўся, а потым пайшоў і ў аспірантуру.

Сфера навуковых інтарэсаў Дзяніса — комплекс машын для збору і транспарціроўкі лясных адходаў, а таксама энергаэфектыўныя і рэсурсазберагальныя методыкі ачысткі лесасек. Праект адной з машын быў распрацаваны на Мінскім трактарным заводзе, на ўніверсітэцкай кафедры праводзілі адпаведныя разлікі і рыхтавалі прапановы па яе ўдасканаленні. Прататып ужо выпрабоўваецца ў Кобрынскім доследным лягасе, мяркуецца, што хутка дапрацаваны экзэмпляр пойдзе ў серыйную вытворчасць.

— Сутнасць праблемы, якую мы вырашалі, заключаецца ў тым, што пасля нарыхтовак на лесасеках звычайна застаецца шмат адходаў: дробнага сучча, абломкаў стваловы, кары, лісты, — тлумачыць навуковец. — Не прыбіраць іх нельга — па-першае, узнікае небяспека пажараў, па-другое, у масе смецця лёгка заводзяцца шкоднікі лесу (тыя ж караеды), якія хутка пераходзяць на «здаровыя» тэрыторыі, і іх у такім выпадку прыйдзецца цалкам высякаць, па-трэцяе, слой рэштак замінае росту маладых дрэў. Звычайна ў нашых лясных гаспадарках гэта робяць уручную ці пры дапамозе імпартных або самаробных прылад.

Створанае абсталяванне аўтаматызуе працэс збору адходаў. Гэта навясная сістэма, якой пры дапамозе крапштэйнаў аснашчаецца звычайны або тралёвачны трактар. Па прынцыпе работы яна нагадвае граблі, толькі вось зубцы тут трымаюцца на спружынах. Гэта зроблена для пераадолення перашкод і няроўнасцяў рэльефу. Падчас руху трактара адходы збіраюцца ў вал, пасля чаго іх можна пагрузіць на транспарціроўшчык і адвезці на перапрацоўку. Потым смецце звычайна здрабняецца на трэскі і выкарыстоўваецца для розных мэт.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

*Хачу на журфак!*

# ВАШЫ ПАРОЛІ

**Сёння хацелася б пагаварыць пра стасункі. Дакладней, пра іх культуру. Цяпер нашы юныя і маладыя няштатныя аўтары практычна не дасылаюць у рэдакцыю звычайных лістоў у канверце. Нормай стала карыстацца электроннай поштай. Хіба толькі часам, калі творчую работу вучню найперш маладшых класаў дапамагала аформіць настаўніца са школы, мы можам атрымаць «пробу пяра» ў тым самым канверце. Ды і тое ў яго будзе ўкладзены не рукапісны тэкст, а раздрукоўка з камп'ютара і дыскета з патрэбным файлам. Як бы там ні было, але карыстанне сучаснымі сродкамі камунікацыі не адмяняе вышэйзгаданую культуру стасункаў, якая была і застаецца абавязковай пры пісьме рукой. Будучыя журналісты, памятайце, што вам давядзецца звяртацца да службовых асоб, а значыць, трэба прытрымлівацца дзелавога стылю. Таму сёння спынімся на вашых «паролях» да яго.**

Некаму можа падацца, што гаворка ідзе пра прапісныя ісціны. Так яно і ёсць. Але ж усе ведаюць выраз «звычка — другая натура»? А некаторыя з іх трэба мяняць. У сецыве вы можаце перапісвацца пад рознымі нікамі, пры звароце ж у рэдакцыю (як і ў далейшым пры афіцыйных стасунках з рознымі службовымі асобамі) трэба цалкам называць сваё імя, прозвішча. Увогуле добрым тонам будзе даць некалькі радкоў інфармацыі пра сябе: у якой школе, якім класе юны ці малады няштатны аўтар вучыцца, чым захапляецца, ці мае вопыт напісання матэрыялаў у газету. Абавязкова пакідайце любы кантактны нумар тэлефона — стацыянарнага ці мабільнага.

Дарэчы, журналісцкія матэрыялы павінны быць падпісаны ў канцы імем і прозвішчам аўтара. Нярэдка ж бывае, што яго няма, ёсць толькі адрас электроннай пошты, ды і тое часта — не ўласна самога няштатніка, а агульны школьны ці асабісты настаўніка. Разабрацца ў такіх хітраспляценнях складана, а калі ідзе паток зваротаў, працэс займае яшчэ і шмат часу.

Матэрыялы ў рэдакцыі пры падрыхтоўцы да друку апрацоўваюцца ў пэўным фармаце, таму тэксты трэба дасылаць у фармаце RTF, кожную фатаграфію — асобна прымацаваным да пісьма файлам, пра што мы ўвесь час нагадваем. Перафарматаванне займае час. Не трэба дасылаць патэнцыяльную публікацыю, заархіваваную ў фармаце RAR ці ZIP, як школьны рэферат. Дарэчы, гэта ж датычыцца не толькі электронных пасланняў, але і памянёных вышэй пасланняў у канвертах: залішне афармляць «пробу пяра», як навуковую працу — з указаннем на тытульным лісце кіраўніка, спасылкі на раённы аддзел адукацыі.

Асобная размова пра адрасы электроннай пошты — яшчэ адзін важны «пароль» для вас. Для стасункаў з равеснікамі падыдуць любыя, прыдуманыя вамі. Калі ж атрымліваеш допісы ў рэдакцыю і чытаеш, што атрымаў пасланне ад «тацця нікі» ці «юляшачкі», гэта выклікае здзіўленне. Уявіце, што вы пры падрыхтоўцы матэрыялу ў якасці журналіста мусіце звярнуцца праз электронную пошту па дапамогу да чыноўніка. Як думаеце, гэта акалічнасць надасць вам сур'ёзнасці? Але і выкарыстоўваць грувасткую абрэвіятуру таксама не варта. Незнаёмы і незразумелы адрас, ды яшчэ пры адсутнасці фотаздымка, успрымаецца як спам. Лепш у якасці адраса электроннай пошты выкарыстоўваць уласнае прозвішча. Што датычыцца фатаграфіі, яна таксама павінна быць больш-менш сур'ёзнай.

Калі мы пішам ліст ад рукі, пасланне заўсёды пачынаецца з прывітання, а заканчваецца развітальнымі словамі, так? Чамусьці пры стасунках праз электронную пошту многія нашы аўтары ігнаруюць гэты момант. Калі табе адказалі, заведзена дзякаваць за гэта, нават калі прагучалі словы крытыкі. Зноў жа многія не лічаць патрэбным так рабіць, дэманструючы, прабачце, узровень выхаванасці. Зразумела, часу ў будучых абітурыентаў зараз бракуе, але аператыўна напісаць некалькі радкоў можна заўсёды. Часта некаторыя аўтары пасля звароту ў рэдакцыю знікаюць «у невядомым напрамку» на некалькі месяцаў, каб потым гэтак жа «раптоўна» ўзнікнуць зноў. Фамільярнасць, карані якой ідуць з прастораў сецыва, таксама недапушчальная. Запомніце патрэбныя «паролі»?

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*

*Прыёмная кампанія — 2017*

# СПРОБА, ЯКУЮ ЛЕПШ НЕ ІГНАРАВАЦЬ

## У абітурыентаў, якія ўдзельнічаюць ва ўсіх этапах рэпетыцыйнага тэсціравання, вынікі на сапраўдных іспытах на 10—15 балаў вышэйшыя

**Піяр-кампанія — акцыя «Адзіны дзень здачы АДЭ бацькамі» — ахапіла нядаўна 50 рэгіёнаў Расійскай Федэрацыі. Ідэя выдатная — даць магчымасць бацькам прайсці праз усе працэдуры адзінага дзяржэкзамену: рэгістрацыю, запаўненне бланка, выкананне невялікай экзаменацыйнай работы, складзенай з заданняў, аналагічных тым, якія даюцца на рэальным экзамене, паколькі большасць дарослых скончылі школу даўно і не маюць ніякага ўяўлення пра тое, што адбываецца за закрытымі дзвярыма. Бацькам далі 40 хвілін на выкананне скарочанага тэста па рускай мове, хоць выпускнікам давядзецца пісаць тэст на працягу трох з паловай гадзін...**

### «Разведка боем»

У адрозненне ад Расіі, у нашай краіне магчымасць прымераць на сябе ролю абітурыента ў кожнага, хто толькі пажадае, з'явілася даўно. Рэпеціраваць будучы экзамен дазваляецца з кастрычніка да канца красавіка. У адрозненне ад цэнтралізаванага, на рэпетыцыйнае тэсціраванне могуць трапіць не толькі абітурыенты, але і дзесяцікласнікі, і бацькі школьнікаў, і настаўнікі, і рэпетытары. Яны могуць прыйсці ва ўніверсітэцкую аўдыторыю, каб на ўласным вопыце пераканацца, ці так проста сыграць ва «ўгадайку», і метадам выпадковага выбару адказаў набраць прыстойную суму балаў. Бо адна справа — разважаць у тэорыі, і зусім іншая — прайсці ўвесь тэст ад «А» да «Я» за строга лімітаваны час.

Многія гэтай магчымасцю актыўна карыстаюцца, не прапускаючы ніводны з трох этапаў «рэпетыцый». Дарэчы, трэці (апошні) этап рэпетыцыйнага тэсціравання стартуе ўжо ў сакавіку. Ён, як правіла, прыцягвае найбольшую ўвагу абітурыентаў, паколькі праходзіць ужо заўсёды з улікам новай спецыфікацыі тэстаў. Да таго ж вясной засвоена ўжо ўся школьная праграма і гэта самы зручны час, каб здзейсніць «разведку боем».

### Ад простага — да складанага

Спецыфікацыя — гэта своеасаблівы алгарытм пабудовы тэста: яна вызначае яго структуру, колькасць заданняў па кожнай тэме і ўзровень іх складанасці. Распрацоўваецца на падставе Праграм уступных іспытаў у ВНУ і ССНУ на бягучы год. **На сайце Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў прадстаўлена спецыфікацыя тэстаў, якія давядзецца здаваць абітурыентам будучым летам.** Так, напрыклад, тэст па беларускай мове будзе складацца з 40 заданняў: 30 заданняў у частцы А (з варыянтамі адказаў) і 10 заданняў часткі В. Больш за ўсё заданняў будзе на «марфалогію і арфаграфію» і «сінтаксіс і пунктуацыю» (па 13). Заданняў першага ўзроўню складанасці прадугледжана ўсяго два і шэсць — пятага ўзроўню.

У тэсце па матэматыцы найбольшая колькасць заданняў (11) будзе прысвечана раздзелу «ўраўненні і няроўнасці». Толькі тры заданні аднесеныя да пятага ўзроўню складанасці, а пераважная колькасць (14, або 46,6%) — гэта заданні трэцяга ўзроўню складанасці. Варыянты адказаў прапануюцца ў 18 заданнях (гэта частка А), без варыянтаў у тэсце будзе 12 заданняў (частка В). На ЦТ па фізіцы таксама прадугледжана 12 з 30 заданняў без варыянтаў.

**На сайце інстытута можна знайсці і дэманстрацыйныя варыянты тэстаў па ўсіх дысцыплінах,** якія даюць магчымасць любому ўдзельніку ЦТ і шырокай грамадскасці скласці ўласнае ўяўленне аб структуры варыянтаў тэстаў, тыпах заданняў і ўзроўні іх складанасці.

### «Дробныя» тэхнічныя моманты?

— Поспех на экзамене залежыць ад многіх фактараў. Псіхалагічная да тэставай формы ўступных іспытаў усе ўжо даўно прывычаіліся, а вось тэхнічная адаптацыя патрабуецца кожнаму новаму пакаленню абітурыентаў, — лічыць **дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мікалай ФЯСЬКОЎ.** — Да рэпетыцыйнага тэсціравання трэба ставіцца, у першую чаргу, як да выдатнага сродку самадыягностыкі і адпрацоўкі тэставых тэхналогій. Гэта ўнікальная магчымасць высветліць, якія існуюць прабелы ў ведах, і на якіх раздзелах школьнай праграмы трэба сканцэнтраваць сваю ўвагу. Упэўнены, што заняткі з рэпетытарам ніколі не дадуць такой багатай інфармацыі для роздуму, як вынікі рэпетыцыйнага тэсціравання. Для некаторых вучняў і іх бацькоў яны становяцца «громам сярод яснага неба», асабліва калі будучыя абітурыенты маюць у школе самыя высокія адзнакі па экзаменацыйнай дысцыпліне. Таксама пры запаўненні бланкаў адказаў выпускнікі набываюць і практычныя навыкі, фарміруюць псіхалагічную ўстойлівасць да стрэсавых сітуацый.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Па словах Мікалая Фяськова, для непадрыхтаванага чалавека гэта цэлая навука — правільна ўносіць у клетачкі адзінкі вымярэння (градусы, працэнты, метры, тоны), лічбавыя адказы ў выглядзе дробу, сімвалы хімічных элементаў або адказ, які складаецца з двух слоў. Незразумела, у якім склоне даваць адказ на пастаўленае пытанне і гэтак далей. А цяпер уявіце сабе, што рабіць гэта даводзіцца ў стрэсавай абстаноўцы сапраўднага экзамену, ад выніку якога залежыць, ні больш ні менш, ваша прафесійная будучыня. Задумвацца над «дробнымі» тэхнічнымі момантамі зусім няма часу, бо гадзіннік няўмольна адлічвае хвіліны, што засталіся да заканчэння выпрабавання... Арганізатары ЦТ заўважылі, што сапраўдны праблемай для абітурыентаў з'яўляецца адмена памылковых адказаў. Таму неабходна вучыцца рабіць гэта загадзя, каб не сапсаваць свой тэставы бал.

«Між іншым, нашы назіранні сведчаць, што ў абітурыентаў, якія прымаюць удзел ва ўсіх этапах рэпетыцыйнага тэсціравання, вынікі, як правіла, на 10—15 балаў вышэйшыя, чым у тых, хто ігнаруе такую магчымасць, — падрэслівае Мікалай Фяськоў. — Кожная новая «рэпетыцыя» экзамену — гэта спосаб яшчэ раз сабе праверыць. Скарыстацца ёй ці не — асабістая справа кожнага. Але я параіў бы не ігнараваць такую магчымасць...»

### Тры сцэнарыі «рэпетыцыі»

Мікалай Фяськоў нагадаў, што на базе Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў **для ўсіх ахвотных арганізуецца таксама і камп'ютарнае тэсціраванне.** Змест тэстаў пастаянна абнаўляецца.

Існуюць тры рэжымы здачы камп'ютарнага тэста. У трэніровачным — няма абмежаванняў у часе, у любы момант можна звярнуцца да падказкі. Апроч таго, пры неабходнасці ёсць магчымасць прыпыніць тэст, каб адпачыць і сабрацца з думкамі. Кантрольны рэжым прадугледжвае рашэнне тэстаў за такі ж самы час, які адводзіцца на ЦТ, і падказкамі карыстацца да завяршэння экзамену нельга.



Ёсць таксама кантрольны рэжым камп'ютарнага тэсціравання на бланку — самы наблізаны да ўмоў «сапраўднага» ЦТ. Яго асаблівасць у тым, што на экране размяшчаюцца дзве укладкі: з заданнямі і з электронным бланкам, у які трэба ўносіць адказы. Бланк аналагічны папяроваму бланку ЦТ, ёсць тут і магчымасць для адмены няправільных адказаў.

Перавагі камп'ютарнага тэсціравання ў тым, што абітурыент адразу даведваецца свой вынік. А таксама ў яго ёсць магчымасць зрабіць работу над памылкамі, убачыць аўтарскае рашэнне задання і даведацца правільны адказ. Балы камп'ютар падлічвае таксама, як і пры здачы тэста на бланку, — па тэхналогіях цэнтралізаванага тэсціравання.

**Камп'ютарнае тэсціраванне праводзіцца ў РІКВ штодня па буднях з 14.00 да 18.00, а ў суботу — у 11.00.** Кошт камп'ютарнага тэсціравання такі ж, як і звычайнага рэпетыцыйнага, — 7 рублёў за адзін прадмет. На сайце інстытута (www.rikc.by) вядзецца анлайн-рэгістрацыя на камп'ютарнае тэсціраванне.

**Здзейсніць аплату за рэпетыцыйнае тэсціраванне можна ў інфакіёсках, плацежных тэрміналах, банкаматах, касава-разліковых цэнтрах банкаў, з выкарыстаннем інтэрнэт-банкінгу, мабільнага банкінгу, а таксама наяўнымі сродкамі ў касах любога банка. Для правядзення плацяжу неабходна:**

**1. Выбраць пункт «Сістэма «Разлік» (АРІП); укладку «Адукацыя і развіццё»; РІКВ/ Рэпетыцыйнае тэсціраванне.**

**2. Для аплаты ўвесці серыю і нумар пашпарта, затым прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас абітурыента;**

**3. Увесці суму плацяжу (калі не ўказана);**

**4. Праверыць карэктнасць інфармацыі;**

**5. Здзейсніць плацеж.**

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

# Парасткі спагады і сяброўства

СУМЕСНЫ ПРАЕКТ. СКАРБОНКА ДОБРЫХ СПРАЎ. ЧЫРВОНКА

**Валанцёрскі атрад «Парастак» у Віцебскай сярэдняй школе №29 імя В.В. Піменава працуе з 2012 года, займаецца двума асноўнымі кірункамі: экалагічным і дапамогай дзецям-інвалідам. У яго рабоце можна вылучыць чатыры кірункі дзейнасці: «Міласэрнасць», «Спорт і здаровы лад жыцця», «Творчасць», «Экалогія».**

Апошнія два гады «Парастак» працуе над праектам «Мы разам» сумесна з Віцебскім дзяржаўным цэнтрам карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі. На працягу гэтага часу дзеці пасябравалі з хлопцамі і дзяўчатамі, якія там знаходзяцца, яны разам святкуюць дні нараджэнняў, праводзяць спартыўныя мерапрыемствы, ладзяць адмысловае свята «Падарунак сябру — сваімі рукамі».

З мэтай сумеснай працы валанцёраў і дзяцей-інвалідаў да Міжнароднага жаночага дня была арганізавана пасадка кветак. І неўзабаве ў многіх сем'ях дома з'явіліся любімыя матулямі расліны, якія вырасцілі самі дзеці.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

*Запрашальнік*

# ФОРУМ МАЛАДЫХ ТЭАТРАЛАЎ

**Магілёўская моладзь у прадчуванні тэатральнага свята: форум «M.art.кантакт-2017» завітае ў горад і будзе панаваць у ім з 21 па 27 сакавіка. У яго праграме 22 спектаклі з 10 краін свету. Гэта значыць, што кожны тэатральны дзень на некалькіх магілёўскіх сцэнах будзе ісці па 3—5 пастановак.**

Не менш насычаная і спецыяльная праграма форуму. У арт-фае драмтэатра маладыя фатографы пакажуць фотапраект «28». Штодня будуць праходзіць прэс-канферэнцыі, абмеркаванні тэатразнаўцамі прагледжаных спектакляў і нават у начны час свята працягнецца для ўсіх ахвотных у сценах пастаяннага партнёра форуму — клуба «КУБА».

Тэатралам-пачаткоўцам выпадзе ўнікальная магчымасць пабываць на майстар-класах у сапраўдных карыфеяў тэатральнага мастацтва.

На працягу форуму будзе працаваць «Майстэрня маладой рэжысуры». У яе рамках адбудзецца чытка п'есы Аляксея Макейчыка «Бзік», якая летась увайшла ў шорт-лісты адразу некалькіх прэстыжных конкурсаў — сучаснай беларускай драматургіі «WriteBox-2016», маладой драматургіі «Любімаўка-2016», міжнароднага конкурсу драматургаў «Еўразія-2016». На тэатральную мову літаратурны твор пераклала рэжысёр Тацяна Ларына, вядомая па пастаноўках у тэатральна-культурным цэнтры імя Усевалада Меерхольда і Цэнтры сучаснай беларускай драматургіі. П'еса прагучыць у выкананні артыстаў магілёўскага абласнога драмтэатра і Цэнтра эксперыментальнай рэжысуры БДАМ.

Падчас круглага стала «Актуальныя тэмы ў сучасным тэатры» будзе прэзентавана кніга Андрэя Масквіна «Беларускі тэатр 1920—1930-х: адабраная памяць». Аўтар — адзін з пастаянных удзельнікаў тэатральнага форуму ў Магілёве, аўтарытэтны эксперт, да меркавання якога заўсёды прыслухоўваюцца.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*



З Наталляй Лубнеўскай

# ІНСТАГРАМ, ТУРНІК, МУЖЧЫНЫ

**Па чацвяргах я хаджу ў басейн. Плаваю не надта хутка, таму звычайна прапускаю ўсіх на дарожцы наперад. Заўважыла, што адзін з мужчын, перш чым стартаваць, праводзіць цэлы рытуал. Распраўляе плечы, размінае рукі, некалькі разоў папраўляе падводныя акуляры, акідвае позіркам увесь басейн і, нарэшце, з пачуццём уласнай годнасці ныраe ў ваду. І так перад кожным заплывам!**

Дзяўчат любяць папракаць: ходзіце на фітнес, каб пакрасавацца. Здаецца мне, што мужчыны ў гэтым ад нас не адстаюць. Мода на здаровы лад жыцця захапіла і іх. Мой знаёмы амаль пасля кожнай трэніроўкі дзеліцца сваімі фатаграфіямі ў сацыяльных сетках. Значнага прагрэсу, калі шчыра, няма, але гэта не перашкаджае яму хваліцца сваёй сілай волі.

Ці вось нядаўні святочны забег сапраўдных мужчын. На прабежку ў цэнтры сталіцы 23 лютага сабралася каля 800 прадстаўнікоў дужага полу. У шапках і з аголеным торсам. Дыстанцыя — 3,5 кіламетра, але наўрад ці хто прыйшоў, толькі каб патрэніравацца. Як той казаў, на іншых паглядзець, сябе паказаць. Ну і памятны медаль не лішнім будзе.

Хлопцы і спорт — гэта, вядома, асобная тэма. Як заявіць на ўсю залу, што ты прыгажунчык? Правільна, падняць як мага большую вагу. Часам жаданне прыцягнуць да сябе ўвагу даходзіць да абсурду. Памятаю, як у трэнажорцы хударлявы юнак, яўна навічок у свеце спорту і жалеза, навесіў на штангу некалькі «бліноў» і пачаў прысядаць. Вельмі стараўся, каб не ўпасці ў вачах іншых наведвальнікаў. Будучага бодзібілдара не спыняў нават хруст у каленях.

Цікава, што мужчыны ніколі не скажуць, што займаюцца спортам, бо незадаволены сваёй знешнасцю. Прынамсі, я такой прычыны ні разу не чула. Трэніруюцца, каб выглядаць яшчэ лепш: яны і так сабе падабаюцца. (Памятаеце карцінку, дзе дзяўчына і хлопец глядзяцца ў люстэрка, і першая бачыць замест сябе пышку, а другі — спартсмена з шырокімі плячамі? Усё праўда.) Ці, каб стаць больш моцнымі. Мой муж, напрыклад, цяпер паставіў сабе мэту — вярнуцца ў сваю найлепшую форму, калі ён мог адцiскацца па 100 разоў. Пакуль што максімум за адзін падыход — 50.

Што ні кажыце, а мужчыны павінны быць спрытнымі і моцнымі (каб насіць нас на руках). Гэта дзяўчаты могуць дазволіць сабе ўрок фізкультуры прасядзець на лаўцы, бо форму забылі («адмазка» на ўсе часы), і хадзіць па зімовым лесе ў ботах на высокіх абцасах, а не на лыжах. А хлопцы мусяць шчыраваць і даказваць, хто з іх «хутчэйшы, вышэйшы, мацнейшы». Бо калі юнак не можа зрабіць падачу ў валейболе ці хоць бы пару разоў падцягнуцца на турніку — зусім бяда.

Дарэчы, калі верыць даследаванню амерыканскіх навукоўцаў, мужчыны любяць спорт больш, чым жанчыны. Кажуць, уся справа ў эвалюцыі: прадстаўнікі дужага полу з даўніх часоў імкнуліся да саперніцтва.

Пры выбары віду спорту мужчыны катэгарычныя — толькі трэнажорная зала. Ніякіх аэробік, пілатэсаў і шэйпінгаў. Маўляў, несур'ёзна, пакіньце гэта ўсё дзяўчатам (хоць падазраю, не кожны хлопец здольны вытрымаць гадзіну энергічных танцаў). Але чамусьці найлепшымі трэнерамі па гэтых, «жаночых», відах фітнесу лічацца ўсё роўна мужчыны. Можа, таму, што дзяўчатам падабаецца павышаная ўвага з боку процілеглага полу, няхай і чыста прафесійная?

Для мяне добры прыклад здаровага ладу жыцця — мой тата. Ён мог не спытаць у нас з сястрой пра адзнакі па матэматыцы ці літаратуры, але тым, што мы робім на ўроках фізкультуры, заўсёды цікавіўся. Сам ён аматарам фітнесу быў яшчэ ў тыя часы, калі аэробіку называлі «рытмічнай гімнастыкай», а «спартсмен, камсамолец, прыгажун» лічылася найлепшым кампліментам. Лыжы, плаванне, паходы... Тата ў свае 50 і цяпер яшчэ дасць фору маладзейшым. Увесь сеанс у басейне ён плавае без перапынку. (І мне хочацца спадзявацца на добрыя гены.)

# ДЫПЛОМ ГАРАНТЫЙ НЕ ДАЕ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)***

Куды цяпер запрашаюць выпускнікоў? На першым месцы па папулярнасці традыцыйна сфера продажаў. На другім месцы — турызм, работа ў гасцініцах і рэстаранах. Трэцяе — за маркетынгам, рэкламай і PR. У сваю чаргу, маладыя людзі размяшчаюць найбольшую колькасць рэзюмэ ў катэгорыях «Продажы», «Кансультаванне», «Інфармацыйныя тэхналогіі, інтэрнэт і мультымедыя». Самымі папулярнымі вакансіямі для студэнтаў і маладых спецыялістаў сталі менеджар па продажах, аператар call-цэнтра, афіцыянт, повар, мерчандайзер, «таемны пакупнік» і прамоўтар.

У маладога спецыяліста, каб зацікавіць работадаўцу, як расказала Святлана Шапарава, у першую чаргу павінна быць высокая матывацыя. «Калі чалавек прыходзіць уладкоўвацца на працу, а праславутага бляску ў вачах няма, находзіць страшэнная туга. Гэта не азначае, што трэба адразу ж фантанаваць ідэямі, але паказваць сваю зацікаўленасць наймальніку — абавязкова», — кажа эксперт. Другі фактар — гнуткасць і магчымасць работы ў рэжыме хуткай змены задач. Сярод іншых важных характарыстык дырэктар сайта таксама называе стрэсаўстойлівасць, скіраванасць на вынік, актыўную жыццёвую пазіцыю, ініцыятыўнасць і здольнасць да хуткага навучання.

«Практычна ўсім цяперашнім выпускнікам прыйдзецца за жыццё пабудаваць некалькі кар'ер, мала хто будзе, як раней, усё жыццё працаваць у адным месцы», — падагульняе эксперт.

## Справядліва ацаніць сябе

**HR-дырэктар «Альфа-банка» Сяргей ПРЫХОДЗЬКА** вылучае некалькі галоўных памылак маладых саіскальнікаў, якія перашкаджаюць ім аб'ектыўна разумець сваё месца на рынку працы. Адна з іх — так званы ўваходны паток жаданняў, калі спецыяліст падчас гутаркі цікавіцца толькі тым, што работа павінна даць яму, і не гаворыць аб тым, што ён асабіста можа прапанаваць. Другая — завышаныя патрабаванні, у прыватнасці, па заробках. На думку эксперта, падчас размовы з работадаўцам не варта адразу называць суму, якую жадаеш атрымліваць, спачатку лепш пацікавіцца, якая на вашай пазіцыі «вілка» заробкаў і ад чаго яна залежыць, а потым ужо даваць уважаныя адказ.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Яшчэ адно памылковае меркаванне — «У мяне дыплом з адзнакай, таму возьмуць адразу». Ва ўмовах перанасычанага саіскальнікамі рынку трэба шукаць шляхі для самаразвіцця: чытаць тэматычныя форумы і кнігі, наведваць майстар-класы і курсы, а таксама праглядаць іншыя рэзюмэ на сваю пазіцыю, шукаючы ўласныя прабелы. Чацвёртая памылка: «У ВНУ мне далі ўсе патрэбныя для працы веды». Насамрэч, яшчэ падчас вучобы варта пацікавіцца, якія кампетэнцыі патрэбны, каб атрымаць работу вашай мары, зрабіць інвентарызацыю сваіх уменняў, а яшчэ лепш — паспрабаваць трапіць на стажыроўку яшчэ да меркаванага працаўладкавання.

«Цана супрацоўніка для работадаўцы — гэта каштоўнасць таго, што ён робіць для кампаніі, — сцвярджае эксперт. — Ад гэтай лічбы трэба адняць кошт працоўнага месца, навучання выпускніка (практычна ў любой кампаніі ёсць спецыяльныя ўводныя курсы, падчас якіх вызначаецца патэнцыял новага супрацоўніка і патрэба ў яго «перанавучанні»), кошт яго памылак (можна так «напартачыць», што вялікая сума будзе пераведзена не туды і яе ніколі не вернеш), а таксама кошт адцягвання ўвагі калег (як правіла, за новымі супрацоўнікамі замацоўваюць больш дасведчаных, і тыя змяншаюць сваю прадуктыўнасць). Але трэба разумець — любая фірма гатова інвеставаць у супрацоўніка, калі той імкнецца да самарэалізацыі. Ужо праз тры месяцы ён павінен «выйсці на самаакупнасць», гэтым і абумоўлена працягласць выпрабавальнага перыяду».

Неадэкватныя амбіцыі таксама зніжаюць каштоўнасць спецыяліста ў вачах работадаўцы — калі чалавек гатовы адразу брацца за любую працу, гэта звычайна кажа пра яго некампетэнтнасць. Шалёны энтузіязм, лічыць Сяргей Прыходзька, не менш шкодны чым поўная пасіўнасць. Яшчэ адзін важны момант — веды пра арганізацыю, у якую саіскальнік хоча ўладкавацца. Некаторыя прыходзяць «проста паспрабаваць» і нічога не могуць сказаць пра каштоўнасці кампаніі — звычайна гэта непрыемна наймальніку.

## Вучыцца і... перавучвацца

«На жаль, сёння нярэдка прыходзіцца канстатаваць, што кадры, якія рыхтуюць нашы ВНУ, за час навучання становяцца непатрэбнымі эканоміці, — сцвярджае **кіраўнік праекта «Атлас новых прафесій» з Маскоўскай школы кіравання «Сколкава» Дзмітрый СУДАКОЎ**. — Усё змяняецца вельмі імкліва, і з цягам часу гэтая хуткасць толькі нарастае. Яшчэ адна важная лічба — 66 працэнтаў працоўных месцаў у Расіі цяпер знаходзіцца пад пагрозай знікнення з-за аўтаматызацыі».

На што разлічваць тым, хто толькі цяпер вырашае, з якой прафесіяй звязаць жыццё? Па словах эксперта, галоўныя трэнды, якія можна прасачыць ужо цяпер, гэта татальнае пранікненне IT ва ўсе сферы жыцця і аўтаматызацыя ў прамысловасці і эканоміцы. Адсюль становіцца зразумела, якія кірункі могуць «выстраліць» у найбліжэйшы час. Гэта ў першую чаргу новыя інфармацыйныя тэхналогіі (у прыватнасці, «воблачныя» сэрвісы, штучны інтэлект і нейрасеткі), робататэхніка для дома, работы і транспарту. Не менш перспектыўны кірунак — энергетыка, асабліва «зялёная». Актыўна развіваецца кірунак новых матэрыялаў і 3D-друк, іх запатрабаванасць можна канстатаваць ужо цяпер. Шмат будзе залежаць ад генетыкі і біятэхналогій, а таксама медыцыны — асабліва перспектыўным цяпер падаецца яе персанальны кірунак (калі лекі прызначаюцца ўрачом з улікам фізіялагічных асаблівасцяў канкрэтнага чалавека).

Новыя сферы дзейнасці будуць патрабаваць новых уменняў. На думку Дзмітрыя Судакова, акрамя непасрэдна тэхнічных навыкаў, якія атрымліваюць падчас вучобы, цяпер вылучающа яшчэ два віды: «мяккія» (тое, што звычайна развіваецца чалавекам самастойна падчас жыцця) і метанавыкі (найменш схільныя да змянення характарыстыкі мыслення чалавека). Да першых адносяцца, напрыклад, камунікацыя, уменне супрацоўнічаць, мультыкультуралізм. Да другіх — крэатыўнасць, адаптыўнасць, уменне вучыцца і перавучвацца.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
2 03 2017 г.

*Жывы гук*

# ДЗЯЎЧЫНА І КЛАРНЕТ

## Дваццацігадовая настаўніца музычнай школы — пра сваю работу і жыццё ў Астраўцы

**«Музыка вымывае з душы пыл паўсядзённага жыцця», — сказаў аднойчы хтосьці з класікаў. Але што бывае тады, калі яна і ёсць твая паўсядзённасць?**

Дзіяна КАВАЛЕЎСКАЯ ніколі не марыла аб музычнай кар'еры, ды і педагогам станавіцца не збіралася. Аднак калі прыйшоў час выбіраць, куды пайсці вучыцца пасля школы, яна без ваганняў падала дакументы ў Лідскі дзяржаўны музычны каледж.

— Я скончыла музычную школу па класе акардэона. Не магу сказаць, што ў мяне меліся выдатныя здольнасці ў інструментальным выкананні, але тым не менш я была ўпэўненая ў сваіх сілах і без праблем паступіла на бюджэт, — успамінае Дзіяна. — Тады мне вельмі хацелася акунуцца ў атмасферу пастаяннага свята і натхнення, якая бывае толькі ў творчых навучальных установах.

На другім курсе дзяўчына пад уплывам сяброў вырашыла паспрабаваць навучыцца іграць на інструменце, які дагэтуль быў ёй невядомы, — кларнеце. Звычайная цікавасць хутка перарасла ў сур'ёзнае захапленне, і ў выніку Дзіяна перавялася з народнага аддзялення каледжа на духавое.

— У звычайных музычных школах кларнет сустракаецца нячаста, у дзяцей большай папулярнасцю карыстаюцца скрыпка, фартэпіяна, гітара і баян. Таму работу давялося пашукаць. У Астравецкую дзіцячую школу мастацтваў мяне бралі з апаскай: дагэтуль тут ніхто не іграў на кларнеце. Я, можна сказаць, стала ў Астраўцы «першаадкрывальнікам» гэтага інструмента.

Тым не менш такая сітуацыя не перашкодзіла Дзіяне ўжо ў першы год работы набраць на заняткі музыкай чатырнаццаць дзяцей (для дваіх з іх кларнет — асноўны інструмент, астатнія выбралі яго ў якасці дадатковага).

— Зразумела, што далёка не ўсе дзеці ідуць у музычную школу па ўласным жаданні, хутчэй, гэтага хочуць бацькі. Яшчэ адзін спецыфічны момант у занятках музыкай — ёсць вучні, якім, на першы погляд, не хапае пэўных якасцяў, — адзначае маладая настаўніца. — Я лічу, што галоўнае ў такіх выпадках — зацікавіць дзіця. Тады і любоў да інструмента з'явіцца, і здольнасці будуць паступова развівацца. А ад нас, настаўнікаў, патрабуецца не толькі добрае валоданне сваім інструментам, але і невычарпальная фантазія, бясконцае цярпенне.



Канцэрты — звычайная справа не толькі для вучняў музычнай школы, але і для настаўнікаў.

Больш за ўсё па часе Дзіяне даводзіцца працаваць з шасцігадовымі хлопчыкам Юрам і дзяўчынкай Сафіяй, якія абралі кларнет асноўным інструментам. Яны толькі пачынаюць знаёміцца з жывой музыкай, магчыма, яшчэ не ўсё ўсведамляюць да канца, таму вельмі важна, каб іх першыя крокі ў гэтай справе былі лёгкімі, падобнымі на гульню, а не на звычайныя школьныя ўрокі.

— Падчас работы з дзецьмі, рэпетыцый і выступленняў (а яны неад'емная частка жыцця любога настаўніка музыкі), бывае, перанасычваешся музыкай і хочацца пабыць у цішыні. З-за гэтага я люблю адпачываць дома. Час ад часу збіраемся з калегамі на гарбату ці глядзім кіно. Некаторыя з іх, каб падзарабіць грошай і не сядзець у вольны час без справы, іграюць на заказ на розных мерапрыемствах (карпаратывах, юбілеях, вяселлях), — расказвае дзяўчына.



Дзіяна і яе «рабочы» інструмент.

— Я працую на паўтары стаўкі (індывідуальныя заняткі плюс аркестр) і атрымліваю за гэта 380 рублёў. Значную частку заробку аддаю за кватэру і на білеты дадому ў Ліду. На жыццё застаецца зусім нямнога, — працягвае Дзіяна.

Кошты на здымнае жыллё ў Астраўцы набліжаюцца да сталічных: ад 60 долараў — за пакой, і ад 120 — за аднапакаёвую кватэру без мэблі. Дзіяне з сяброўкай пашчасціла знайсці «двушку» за 180 долараў, але ўсё роўна для маладога спецыяліста гэта занадта дорага. «Напрыклад, у маёй роднай Лідзе можна зняць жыллё ў 2—2,5 раза танней, — параўноўвае дзяўчына. — Апошнім часам, праўда, кіраўніцтва паабяцала вырашыць жыллёвую праблему...»

Невялікі горад, дзе ўзводзіцца АЭС, паступова мяняе сваё аблічча: шмат чаго будуецца, развіваецца інфраструктура, з'яўляюцца новыя месцы для адпачынку. І, безумоўна, праз некаторы час жыццё ў Астраўцы будзе віраваць. Несумненна, будзе запатрабавана ў горадзе і музычнае майстэрства, у тым ліку і ігра на такім рэдкім сёння кларнеце.

**Ганна КУРАК, студэнтка V курса Інстытута журналістыкі БДУ.**

*Код поспеху*

# СКЛАДАЮЧЫ ЛЁС, ЯК ПАЗЛ

## Сакрэты маладога праграміста

**Хутка новы паток выпускнікоў зойме свае першыя працоўныя месцы ў самых розных сферах народнай гаспадаркі. Пакуль жа будучыя маладыя спецыялісты маральна рыхтуюцца да гэтага важнага кроку ў сваім жыцці. Многія хвалююцца: што іх чакае наперадзе? Алена ТАРАСЮК год назад скончыла Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна па спецыяльнасці «прыкладная матэматыка».**

Дзяўчыне яшчэ з дзяцінства вельмі падабалася матэматыка, таму з выбарам вызначылася адразу. Што датычыцца месца будучай вучобы, дык Алену заўсёды прыцягваў Брэст. Ціхі, спакойны, і людзі ў ім бачыліся прыемнымі.

Вучыцца дзяўчыне падабалася, хоць першыя тры гады было няпроста, але потым усё «пайшло». Неяк за ўніверсітэт прыйшлі некалькі чалавек з адной фірмы і расказалі, хто такія праграмісты і чым яны займаюцца. Пасля гэтай размовы з'явілася жаданне паспрабаваць сябе ў гэтай ролі. Было тое пасля трэцяга курса. Алена прайшла гутарку на курсы, пасля абараніла праект, і за запрасілі ў лабараторыю працягваць стажыроўку. Далей час пабег яшчэ хутчэй: вучоба і праца, дыплом і дзяржаўныя экзамены — на ўсё знайшліся сілы.

І вось ужо паўтара года нядаўняя выпускніца працуе інжынерам-праграмістам. Сумаваць ёй проста няма калі: камандзіроўкі ў Мінск, загрузка ў самім офісе.

— Распрацоўваем сэрвісы для браніравання гатэляў з вялікай колькасцю ўнутраных бонусаў. Але самае цікавае — гэта сустрэчы і пастаянныя тэлефанаванні з кіраўніцтвам на англійскай мове, слоўнікавы запас якой пастаянна пашыраецца, — кажа Алена. — Графік работы ў мяне гнуткі. Можна працаваць з 9 да 18, але пры гэтым можна прыйсці і ў 10, толькі ўжо працаваць трэба да 19. Часта прыходзіцца затрымлівацца.

У планах дзяўчыны на наступныя год-два — кар'ерны рост. Яна думае вучыцца далей. Ёсць два варыянты: ісці на матэматыка ў магістратуру або атрымліваць другую вышэйшую адукацыю юрыдычнага профілю. Пакуль Алена ў роздумах. У найбліжэйшы час яна хоча здаць экзамен на старшага інжынера-праграміста, але для гэта патрэбны вопыт, які цяпер актыўна назапашваецца. У жыццёвых прыярытэтах і сям'я.



Нягледзячы на загрузку на рабоце, вольнага часу ў Алены дастаткова. Дзяўчына ходзіць у спартзалу, з сябрамі выбіраецца ў кіно і тэатр, і, вядома ж, проста на прагулкі па горадзе. Што датычыцца іншых захапленняў, суразмоўніцы падабаецца вышываць крыжыкам, а цяпер яшчэ і гуляць у настольныя гульні. Таксама любіць складваць пазлы: у калекцыі ёсць некалькі на тысячу элементаў.

— Акрамя таго, хоць я і не настаўнік, але вучу дзяцей. І рада гэтаму. На рабоце ў нас ёсць дзіцячы гурток па праграмаванні, — гаворыць Алена. — Вучымся пісаць гульні і ствараць анімацыю. Зрабіў сам — гуляць дазваляецца!

**Таццяна ЛАУШ, студэнтка IV курса факультэта гісторыі, камунікацыі і турызму ГрДУ імя Янкі Купалы.**

# «Граблі» для... лесу

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Акрамя таго, машына збірае толькі буйное смецце, а вось дробныя адходы застаюцца на лесасецы для перагною — такім чынам, не парушаюцца натуральныя працэсы самаўзнаўлення лесу. Шырыня паласы, якую за адзін заход апрацоўвае сістэма, — 2,4 метра, значыць, работа выконваецца ў разы хутчэй, чым ручным спосабам. Калі вальшчык затраціць на збор адходаў з лесасекі прыкладна адну змену, то трактар зробіць гэта ў сярэднім за пару гадзін.

— Наколькі я ведаю, у Кобрыне вельмі задаволены нашай распрацоўкай, — адзначае Дзяніс. — Я двойчы ездзіў туды на выпрабаванні: першы раз манціравалі ўстаноўку спераду трактара, другі — ззаду. Абодва разы ўборка прайшла выдатна, і аператары казалі, што ім зручна працаваць, мантаж таксама вельмі просты і хуткі. Рабочыя, дарэчы, таксама ўнеслі пэўныя прапановы. Таму, мяркую, што калі запусцім тэхналагічнае абсталяванне ў серыю, лягсасам стане прасцей. Цяпер выпрабоўваем мадэрнізаваны доследны экзэмпляр сістэмы, хутчэй за ўсё, наступны стане фінальным.

Яшчэ адна прапанова Дзяніса датычыцца захавання падлеску. Па словах хлопца, пры зборы адходаў з лесасекі маладняк нярэдка пашкоджваецца. Таму ў некаторых месцах больш рацыянальна або зусім не збіраць адходы, або рабіць уборку пры дапамозе харвестара — аператары высокай кваліфікацыі могуць ачышчаць ствалы дрэў, адразу ссыпаючы лішняе ў адно месца. У такім выпадку можна абысціся без прымянення зборачных машын, а адразу пагрузіць адходы на транспарціроўшчык.

**«Вучыцца было цікава, я адразу зразумеў, што зрабіў правільны выбар».**

На кафедры працуюць над цэлым шэрагам машын, і не толькі для сферы лясной прамысловасці. Так, напрыклад, разам з прадпрыемствам «Амкадор» вядзецца работа над новым шматфункцыянальным мульчыравальнікам — на яго можна навешваць разнастайнае абсталяванне для догляду за дарогамі і іншых задач. Адзін з варыянтаў — фрэза, якая дапамагае пракладваць прасекі ў зарасніках.

— Тэхніка для лясной прамысловасці не менш складаная і захапляльная, чым у любой іншай сферы. Я штодзень даведваюся нешта новае, шукаю гэтаму прымяненне, — прызнаецца Дзяніс. — Заробак у мяне, можа, і не самы вялікі, але ж я яшчэ фактычна вучуся, жыву за аспірацкую стыпендыю. Таму Прэзідэнцкая стыпендыя — добрая дапамога. Асобна даплачваюць за навуковыя даследаванні, таму на пражыццё мне хапае. Што датычыцца планаў, то я хачу дапісаць і абараніць дысертацыю, а потым стаць выкладчыкам на кафедры. Гэта таксама цікавая работа, у нашага ўніверсітэта ў Негарэльскім лягсасе ёсць эксперыментальная база са сваёй тэхнікай, куды мы возім практыкавацца студэнтаў. Таму ад любімай справы я не адрываюся.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

*Карані залежнасці*

# ЖЫЦЦЁ ПАСЛЯ СПАЙСУ

## Якім яно склалася ў тых, хто некалі зрабіў неабдуманы крок

**Некалькі гадоў таму Беларусь даведалася пра спайсы: пра небяспечныя курыльныя сумесі загаварылі ўсе, а для органаў правапарадку гэтая праблема стала адной з прыярытэтных. Апошнім часам жахлівых навін стала менш, — абарот сінтэтычных сумесяў у краіне сапраўды ўдалося скараціць. Але наколькі? Мы ведаем толькі пра тых ахвяр спайсу, якія трапілі ў поле зроку медыкаў або міліцыі. А што сталася з астатнімі сотнямі і тысячамі беларускіх падлеткаў, якія калісьці не ўтрымаліся ад зацяжкі?**

— У 2010 годзе я мог з упэўненасцю сказаць, што кожны пяты мой знаёмы калі-небудзь курыў спайс, — расказвае старшакурснік Максім (тут і далей імёны герояў зменены). — Сам я пакаштаваў «хімію» гадоў у 15. Тады яна якраз набірала папулярнасць, бо яшчэ не была забаронена. Спачатку курыў натуральную «траўку», а потым у летнім лагеры да мяне ў рукі патрапілі «міксы». Я тады яшчэ наогул не ведаў, што гэта такое. Крыху пазней яны з'явіліся і ў Магілёве і сталі даступнымі для ўсіх: кішэнных грошай на іх хапала, дастаць было не складана.

Пазбегнуць залежнасці ад «хіміі» Максіму, паводле яго слоў, дапамагло тое, што яны з сябрамі не курылі занадта часта.

**Аукцион проводится 5 апреля 2017 года в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Ильича, д. 51а, в административном здании Гомельского райисполкома (малый зал, 3-й этаж).**

**Заявления об участии в аукционе и прилагаемые к ним документы принимаются по адресу: Гомельский район, агрогородок Ерёмино, ул. Советская, 150, 1-й этаж, кабинет 4 с даты опубликования по 29.03.2017 с 8.30 до 17.00, обед – 13.00–14.00, выходные дни – суббота, воскресенье.**

Условия участия в аукционе.

Для участия в аукционе гражданин (лично либо через своего представителя) в установленный в извещении о проведении аукциона срок подает заявление на участие в аукционе с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка, который предполагается получить в частную собственность по результатам аукциона, представляет документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка, а также заключает с Ерёминским сельским исполнительным комитетом соглашение установленной формы.

Кроме того, в комиссию или организацию представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность;

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют документ, удостоверяющий личность.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию или организацию в указанные в извещении сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие задаток в размере, порядке и сроки, определенные в извещении о проведении аукциона, а также заключившие соглашение.

После получения необходимых документов от гражданина на участие в аукционе комиссия выдает ему билет участника аукциона с указанием даты регистрации заявления и номера, под которым он будет участвовать в аукционе. Данные о каждом участнике аукциона заносятся в книгу регистрации участников аукциона.

Участник аукциона имеет право до начала аукциона письменно отозвать заявление об участии в нем. Неявка участника аукциона на аукцион приравнивается к письменному отзыву заявления об участии в нем. При этом участнику аукциона в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона возвращается сумма внесенного им задатка.

Письменный отзыв заявления или неявка участника аукциона на аукцион регистрируется в книге регистрации участников аукциона.

Прием заявлений об участии в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленный комиссией или организацией день и час, но не ранее чем за 3 рабочих дня до даты проведения аукциона. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в комиссии или организации.

Сведения об участниках аукциона не подлежат разглашению.

Перед началом аукциона его участники обязаны зарегистрироваться в комиссии и обменять билеты участников аукциона на аукционные номера, которые возвращаются в комиссию после окончания аукциона.

Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:

1. в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся:

1.1. внести плату за право приобретения земельного участка в частную собственность;

1.2. возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документов, необходимых для его проведения, формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого участка;

2. в течение двух месяцев, но не позднее трех месяцев со дня утверждения протокола о результатах аукциона обратиться в Гомельский межгородской филиал республиканского унитарного предприятия «Гомельское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» за государственной регистрацией земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него (г. Гомель, ул. Войкова, 87);

3. выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка.

Участникам предоставляется возможность осмотра земельного участка на местности с членами комиссии (по предварительному согласованию).

**Справки по адресу: Гомельский район, агрогородок Ерёмино, ул. Советская, 150, тел.: 96-02-12, 96-03-62**

SEX=БАЛЯСЫ

# Паміж X і Y

**Калі хто не ведае, гэта не толькі матэматычныя знакі. Так яшчэ навукоўцы абазначаюць два пакаленні: пакаленне X (народжаныя з 1965-га па 1979 год) і пакаленне Y (хто з'явіўся на свет пасля 1981 года), апошнія — гэта фактычна дзеці першых (ёсць яшчэ, як вядома, пакаленне Z — дзеці 2000-х. Але размова тут не пра іх). І розніца паміж пакаленнямі вельмі адчувальная не толькі з-за ўласна даты нараджэння. Каб зразумець як прычыны, некаторым даводзіцца вырашаць жыццёвыя ўраўненні з гэтымі самымі невядомымі. Розніца паміж 40—45-гадовымі і больш маладымі — у падыходах да ўсяго. («— Раней як яно было? — Як? — Вось! А цяпер што? — Што? — Дык я пра гэта і гавару!») Прадстаўнікоў старэйшага пакалення навукоўцы называюць прагматыкамі. («Дзяцінства — гэта калі цябе не хвалюе чужое меркаванне. Табе проста напляваць, абсыпаў крыўдзіцеля пяском і ўсё».) Прадстаўнікі другога — больш інфантыльныя, глыбока ўцягнутыя ў лічбавыя тэхналогіі юнакі і дзяўчаты. («Дарослае жыццё хоча дадаць вас у сябры. Адхіліць. Пазначыць як спам. Заблакіраваць».)**

...Маладзейшы калега расказаў такую гісторыю. Вяртаўся позна ўвечары з камандзіроўкі, злавіў у аўтобусе зацікаўлены погляд жанчыны. Дама сама прапанавала пазнаёміцца і правесці яе дадому. Расказала пра сябе, распытала пра яго. Папрасіла дадаць у сябры ў сацыяльных сетках, прапанавала як-небудзь выпіць разам кавы. Як вы думаеце, да якога пакалення адносілася візаві калегі? Вядома ж, да пакалення X, якое, як даводзяць даследчыкі, прывыкла разлічваць толькі на сябе найперш і якое гатовае да перамен! («Пятніца. 21.00. Сумная, слабая і безабаронная баба зайшла ў бар... 0.00. Вясёлая, моцная і незалежная жанчына з мужыком пад пахай выйшла з бара!») Цяпер ужо пра пакаленне Y варта гаварыць словамі Іпаліта з «Ироніі лёсу»: «У нас знік дух авантурызму! Мы перасталі лазіць у вокны да любімых дзяўчат». Па высновах навукоўцаў, пакаленне Y схільнае адцягваць пераход у дарослае жыццё на больш позні тэрмін, чым іх равеснікі ў папярэдніх пакаленнях. («У агенцтве: — Хачу зняць кватэру з маладым чалавекам. Цана — па дамоўленасці. З мэбляй і бытавой тэхнікай. — Малады чалавек ваш ці наш?») Пакаленню X, кажуць даследчыкі, уласціва глабальная інфармаванасць і нефармальнасць поглядаў. («Дзед, а як ты з бабуляй пазнаёміўся? — Па інтэрнэце. — Тады ж яшчэ не было інтэрнэта. — Пачакай, ты пра якую канкрэтна бабулю?»)



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

А вы чулі такую навіну? У Японіі ўсё больш папулярнай робіцца новая мадэль адзення — вязаны світар без рукавоў з вялікім выразам ззаду. Малюнкі і фатаграфіі мадэляў у ім набылі ў краіне вірусную папулярнасць, крамы даюць справаздачы, што запасы навінкі закончыліся. Як ствараілі, каб вярнуць інтарэс моладзі да... сексу. Эх, а быў жа час... («Мужчынская кашуля на дзяўчыне — гэта як сцяг на заваяванай крэпасці».) У японскай мове нават з'явіўся тэрмін для абазначэння падобных навінак: «Адзенне, якое забівае нявінніка». Як вам? Так і хочацца сказаць пра сябе, што «ўзрост вызначаецца не гадамі, а колькасцю страчаных ілюзій». Маецца на ўвазе, што сексуальнасць такіх «строяў» можа напросту «забіць» непадрыхтаванага мужчыну. Згодна з даследаваннямі японскіх арганізацый, тамтэйшыя мужчыны часта баяцца інтымнай блізкасці з процілеглым полам. Многія з іх увогуле аддаюць перавагу стасункам з віртуальнымі сяброўкамі — любімымі гераінямі анімэ ці лічбавымі аватарамі. Сарамлівых маладых японцаў часта называюць траваеднымі, а іх крытычная колькасць псуе нацыянальныя прагнозы па нараджальнасці. («Маладосць — час, калі ў цябе куча энергіі, якую ты можаш патраціць на што заўгодна! Напрыклад, тыднямі не выходзіць з дома, гледзячы серыялы».) І гэта ўсё пра пакаленне Y. Як уяўляецца жыццё больш прагматычным старэйшым зямлянам? «16 гадоў: жыццё — гэта боль і адчай, толькі смерць здольная прынесці спакой. 36 гадоў: оп-панькі, патэльня па акцыі, вазьму дзве».)

З-за чаго ўсё гэта адбываецца? Пачытайце ў сецібе нататкі пра гэта расійскага акцёра, тэлевядучага, шоўмена Дзмітрыя Нагіева: ён вельмі трапна апісвае сутнасць праблемы і яе прычыны. Так, мужчына — гэта той, хто ўмее прымаць рашэнні і браць на сябе адказнасць за іх. Акцёр піша, што калі мужчына прымае рашэнні, але нясе за іх адказнасць жанчына, гэта не мужчына, а мамчын сынок, мужчынка. («— Мам, я прыбраў за сабой усе цацкі, як ты прасіла! — Я прасіла знайсці работу і з'ехаць».) Даследчыкі пацвярджаюць: пакаленне Y імкнецца як мага даўжэй заставацца ў бацькоўскім доме. («— Мам, я ўсё з'еў! — Вось таму, сынок, мы і хочам, каб ты з'ехаў!») Нагіеў піша далей: калі мужчына не прымае рашэнні, але разам з тым нясе за іх адказнасць, гэта не мужчына, а падабцаснік, мужычок. («Дзед-падабцаснік схапіўся за сэрца, але строгі позірк жонкі прымусіў яго пражыць яшчэ 20 гадоў».)

Акцёр абвінавачвае бацькоў і піша, што не шкадуе жанчын, якія выхавалі сваіх сыноў, як дачок. («— Мама, яна кусаецца! — А я табе казала: не жаніся!») А бацькі — гэта ж пакаленне X! Дзе адбыўся збой, чаму яны не выхавалі нашчадкаў на сваім прыкладзе? Магчыма, у «ліхія» 1990-я бацькам было не да выхавання, галоўным было выжыць. Плюс развіццё тэхналогій. («— Ты гуляць пойдзеш? — Я за інтэрнэт плачу, каб з дома выходзіць, так?») Гэта пра пакаленне Y. Цяпер пра пакаленне X. «Як добра, што мы паспелі падурэць у маладосці! Ніхто на тэлефон не здымаў, у інтэрнэт не выстаўляў...» Вось такая розніца.

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «Сіл надаюць успаміны аб перамогах»

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)**

***— Адразу пасля студэнцкага старту адбыўся яшчэ больш сур'ёзны турнір...***

— Так, чэмпіянат свету на асобных дыстанцыях у Карэі, гэта своеасаблівая рэпетыцыя перад Алімпійскімі гульнямі 2018 года. Там з-за вельмі сур'ёзнай канкурэнцыі выступаць было значна складаней, чым у Алматы. На дыстанцыі тры і пяць кіламетраў я паказала нядрэнны час, палепшыла свае асабістыя вынікі і паставіла нацыянальныя рэкорды, але эмацыянальна адчувала сябе на гэтым турніры не вельмі добра. Два месяцы наогул не было ніякіх стартаў, а потым адразу некалькі сур'ёзных, прычым з невялікімі перапынкамі. Таму крыху не хапіла адрэналіну: вынік мог бы быць яшчэ лепшы. Звычайна з такім часам нават трапляюць на п'едэстал або як мінімум у ТОП-5, але ў гэты перадалімпійскі сезон усе спартсмены значна падцягнуліся. У першай сусветнай дзясятцы канкурэнцыя велізарнейшая.





***— Эмацыянальна табе складана настройвацца на старт?***

— Для мяне не мае значэння — гэта буйны міжнародны турнір або чэмпіянат краіны. Больш важна, якія адчуванні ў канкрэтны дзень. Калі выспалася, добра паела, у цэлым добра сябе адчуваю, то звычайна вельмі хачу бегчы. Але калі адчуваю, што са мной нешта не так, адцягваюць нейкія думкі, то адразу ўсё мяняецца.

Падабаецца, калі на стадыёне шмат балельшчыкаў, моцная падтрымка, гэта заводзіць, хочацца бегчы яшчэ хутчэй.

***— Кожны спартсмен сутыкаецца як з поспехамі, так і з няўдачамі. Як іх перажываеш?***

— Не буду хаваць, цяжка аднаўляюся пасля правальных стартаў. Падае матывацыя, спартыўны дух, але потым успамінаю, што магу многае. Трэнер просіць мяне весці дзённік поспехаў, таму што я звычайна хутка забываю пра свае перамогі, а ўспаміны пра іх дапамагаюць у складаныя хвіліны.

***— У дзяцінстве ў цябе былі куміры?***

— Не, а вось зараз мне вельмі падабаецца Барт Свінгс. Ён вельмі спартыўна складзены, тэхнічны. А наогул мяне натхняе Дар'я Домрачава, заўсёды за яе моцна перажываю і радуюся. Нехк было нават такое, што трэнер, ведаючы, як я да яе стаўлюся, перад маім адказным стартам раздрукаваў фатаграфіі Дашы і абклеіў імі пакой. Я разумею, што цяжка яна трэніруецца. Бачна, як яна любіць справу, якой займаецца, і з якім гонарам заўсёды выступае за нашу краіну.

Я, дарэчы, таксама хацела б стаяць на п'едэстале і слухаць наш гімн, глядзець, як падымаецца беларускі сцяг. Гэта неверагодны гонар, дзеля якога хочацца выйграць важныя спаборніцтвы.

***— Як увогуле ты пачала займацца спортам?***

— Каля 101-й школы ў Мінску, дзе я вучылася, была невялікая спартыўная секцыя, летам мы там каталіся на роліках, зімой на школьным стадыёне — на каньках. У якіх толькі спаборніцтвах ні выступалі, але ў мяне не было асаблівага фанатызму да спорту. Дзесьці ў 17 гадоў вынік пачаў знікаць, як звычайна гэта бывае, і я вырашыла кінуць спорт. Скончыла вучылішча алімпійскага рэзерву і пачала сама трэніраваць дзяцей. Гэта быў такі добры час, з задавальненнем успамінаю яго. Пазней пазнаёмілася (на той момант з калегам, а цяпер ужо з маім трэнерам) Сяргеем Мініным. Ён прапанаваў паўдзельнічаць у спаборніцтвах на роліках, я пагадзілася і... выйграла ва ўсіх дзяўчат з яго групы.

***— Таму і вырашыла вярнуцца?***

— На той момант працавала на дзвюх работах, вучылася ва ўніверсітэце. Таму спачатку дамовіліся хоць бы на адну трэніроўку, потым на дзве і гэтак далей. Сумленна скажу: я часта іх прагульвала. Але ў мяне была матывацыя — я «завязала» з канькамі, калі была кандыдатам у майстры спорту, а вельмі хацела выканаць майстра. Паспрабавала ўдзельнічаць у марафоне, дзе стартавала больш за тысячу спартсменаў, і трапіла адразу ў 10-ку. Усё неяк лёгка і проста атрымлівалася, восенню прыйшла на лёд і так добра прабегла, што ўсяго секунды мне не хапіла да майстра спорту. За год дасягнула мэты, потым трапіла на п'едэстал чэмпіянату краіны, выканала нарматыў для таго, каб мяне ўзялі ў зборную. І так атрымалася, што пацыху вярнулася.



***— Колькі часу ў цябе займае спорт зараз?***

— Падчас сезона ўвесь дзень — дзве трэніроўкі, аднаўленне, працэдуры. Але цяпер мне гэта ў кайф. Вольны час я таксама праводжу актыўна — катаюся на веласіпедзе, роліках, часам праводжу заняткі для дзяцей. На роліках адпачываю, атрымліваю ад гэтага задавальненне. Многія спартсмены з іншых краін, як і я ў міжсезонне, удзельнічаюць у розных сусветных марафонах, гэта добрая практыка. Ну а веласіпед, гэта, наогул, мой транспартны сродак, толькі на ім і езджу па Мінску. Трэнер падлічыў, што з сакавіка па лістапад я праязджаю каля 5—6 тысяч кіламетраў.

***— Ведаю, што ў асноўным табе даводзіцца трэніравацца ў мужчынскім калектыве. Гэта складана?***

— Мне б хацелася, каб побач былі матываваныя, прафесійныя людзі, а хто гэта будзе — не важна. Няма часу праяўляць свае дзявочыя слабасці, можа быць, гэта і ёсць адбітак працы побач з мужчынамі.

***— Сукенкі і абутак на абцасах сабе дазваляеш?***

— Рэдка, але магу на стадыён у іх прыйсці. Ды я ўвогуле пра гэта нават не задумваюся. Апранаюся так, як падабаецца, як зручна, але сачу за сваёй знешнасцю, не люблю быць пацанкай. А вось з шопінгам бывае складана: не магу доўга хадзіць па крамах, хоць раней гэты занятак мне вельмі падабаўся. Цяпер думаю — лепш выспацца, адпачыць.

***— Я заўважыла, што ў прэсе вельмі мала тваіх інтэрв'ю, з чым гэта звязана?***

— Сустрэчы з журналістамі забіраюць шмат часу і сіл. Але мне нават падабаецца, калі задаюць цікавыя пытанні, хоць я і не вельмі люблю расказваць пра сябе. Усё залежыць ад таго, у які перыяд мяне просяць аб сустрэчы. Скажу шчыра: перад спаборніцтвамі я не люблю адцягваць увагу на такія мерапрыемствы.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве
«Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.008.
Нумар падпісаны ў 19.30 2.03.2017 г.

# ЮРЫДЫЧНАЯ СІЛА МОВЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**Аўтар манаграфіі «Мова беларускага заканадаўства XX стагоддзя: генезіс і эвалюцыя», дацэнт кафедры гісторыі беларускай мовы філфака БДУ, кандыдат філалагічных навук Ганна КУЛЕШ** займаецца вывучэннем гэтай тэмы больш як 20 гадоў.

«Нягледзячы на тое, што ў грамадстве жыве стэрэатып, быццам бы беларуская мова ў заканадаўстве не ўжываецца, хачу заявіць, што ўсе кодэксы, якія прымаліся ў нашай краіне да другой паловы 90-х гадоў XX стагоддзя, выдаваліся па-беларуску, — падкрэслівае навуковец. — Мова заканадаўства развівалася ў тым ліку і таму, што да 2012 года ўсе законы і дапаўненні да дзеючых законаў і кодэксаў перакладаліся і публікаваліся ў афіцыйным друкаваным органе Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу — газеце «Звязда». Але з 2012 года адзіным месцам афіцыйнага апублікавання ўсіх заканадаўчых актаў стаў Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал».

— У функцыі нашага цэнтра ўваходзіць збор, апрацоўка, афіцыйнае апублікаванне і распаўсюджванне прававой інфармацыі. Згодна з артыкулам 63 Закона аб нарматыўных прававых актах, іх афіцыйнае апублікаванне адбываецца на той мове, на якой яны былі прынятыя, — тлумачыць сітуацыю **начальнік упраўлення рэдакцыйна-выдавецкіх работ Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі Наталля СУДЗІЛОЎСКАЯ.** — Закон павінен прымацца адначасова і на рускай, і на беларускай мовах, толькі тады беларускі варыянт можна лічыць афіцыйным перакладам. Кодэкс аб культуры прымаўся на беларускай мове, таму на ёй і апублікаваны.

Дзеючая рэдакцыя Кодэкса аб адукацыі апублікаваная толькі на рускай мове. Праект новай рэдакцыі кодэкса, які плануецца ўнесці ў парламент да 1 ліпеня, таксама ствараўся на рускай мове.

**«Трэба ствараць прэферэнцыі, у тым ліку і фінансавыя, для тых педагогаў, якія выкладаюць няпрофільныя дысцыпліны на беларускай мове».**

**Член Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Алена АНІСІМ** прапанавала стварыць рабочую групу для перакладу Кодэкса аб адукацыі на беларускую мову: час да ўнясення законапраекта ў парламент яшчэ ёсць. Яна паведаміла, што ўзнімала ў парламенце пытанне аб пашырэнні выкарыстання ў заканатворчай дзейнасці беларускай мовы. І атрымала адказ з Камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце, у якім сказана, што разгляд і прыняцце законапраектаў адразу на дзвюх дзяржаўных мовах пацягне істотнае ўскладненне заканадаўчай працэдуры, павелічэнне часу разгляду законапраектаў. Аптымальным варыянтам вырашэння гэтага пытання ў камісіі бачаць кардынальнае павелічэнне колькасці законапраектаў, якія ўносяцца і разглядаюцца ў Палаце прадстаўнікоў на беларускай мове. У прыватнасці, выключна на беларускай мове маглі б прымацца законы, якія рэгулююць грамадскія адносіны ў сферы адукацыі, навукі, культуры, нацыянальныя адносіны, а таксама законы, якія тычацца пытанняў правоў чалавека, сям'і і моладзі, дзейнасці сродкаў масавай інфармацыі і г. д.»

## Ва ўмовах білінгвізму

— Сутнасць дзяржаўнага двухмоўя заключаецца ў наступным: кожны грамадзянін краіны мае права карыстацца ў сваёй дзейнасці любой дзяржаўнай мовай і атрымліваць любую інфармацыю — прававую, культурную і паўсядзённую — на любой дзяржаўнай мове, — падзяліўся сваім бачаннем сітуацыі **першы намеснік дырэктара па навуковай рабоце Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Аляксандр ЛУКАШАНЕЦ.** — Другі асноўны прынцып — дзяржава праз свае інстытуты і сваіх прадстаўнікоў павінна забяспечыць кожнаму грамадзяніну рэальнае права карыстацца любой з дзяржаўных моў. Калі мы будзем падыходзіць да прававой сферы дзейнасці менавіта з такіх моўных пазіцый, то ўсе законы, заканадаўчыя акты, указы Прэзідэнта павінны распрацоўвацца, абмяркоўвацца і зацвярджацца на дзвюх дзяржаўных мовах. Тады абодва варыянты будуць мець юрыдычную сілу.

— А ці многія з прысутных ведаюць, чаму ў Законе «Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь» першай згадваецца беларуская мова?— пацікавілася ва ўдзельнікаў круглага стала **прафесар кафедры беларускай і замежных моў Акадэміі МУС, доктар філалагічных навук, дацэнт Валянціна МАРОЗ.** — У законе напісана, што «...дзяржаўнымі мовамі Рэспублікі Беларусь з'яўляюцца беларуская і руская мовы». У розных аўдыторыях звычайна даводзіцца чуць прыкладна такія адказы: маўляў, «літара «б» першая ў алфавіце» ці «таму што беларуская — наша родная мова». Насамрэч адказ на



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

гэта пытанне ляжыць выключна ў прававой плоскасці. Дзяржаўны статус беларускай мове быў нададзены Законам «Аб мовах у Беларускай ССР», прынятым у студзені 1990 года. У 1994 годзе ў суверэннай Беларусі дзяржаўны статус беларускай мовы замацавалі ў Канстытуцыі. Па выніках жа рэферэндумаў 1995 і 1996 гадоў у нас устанавілася дзяржаўнае беларуска-рускае двухмоўе (білінгвізм). Пытанне на рэферэндуме гучала так: «Ці згодныя вы, каб руская мова была далучана ў дзяржаўным статусе да беларускай?» Адказ быў станоўчым. Але паколькі менавіта руская мова была далучана ў дзяржаўным статусе да беларускай, гэты парадак вытрымліваецца цяпер і ў Канстытуцыі, і ў Законе «Аб мовах», куды былі ўнесены адпаведныя змяненні ў 1996 годзе.

## Здаваць дзве мовы, а не выбіраць

На думку Аляксандра Лукашанца, трэба ствараць прэферэнцыі, у тым ліку і фінансавыя, для тых педагогаў, якія выкладаюць няпрофільныя дысцыпліны на беларускай мове. Гэта сусветная практыка, калі падтрымліваюць спецыялістаў у галіне менавіта той мовы, якая вымагае грамадскай падтрымкі. Можна паглядзець на вопыт Канады ці Фінляндыі. Да таго ж выпускнікі павінны здаваць экзамен за курс сярэдняй школы па дзвюх мовах: беларускай і рускай, а не выбіраць паміж імі. Тое ж датычыцца і абітурыентаў, якія здаюць дзяржаўную мову пры паступленні ў ВНУ...

Дарэчы, магчымасць выбару адной з дзяржаўных моў прывяла да таго, што беларускую мову здавалі ў апошнія гады толькі 15—20% ад агульнай колькасці абітурыентаў.

— Для беларускамоўных сем'яў вялікая праблема — забяспечыць сваім дзіцяці бесперапыннае навучанне на беларускай мове ад дзіцячага садка да ўстановы, дзе маладыя людзі атрымліваюць прафесію, — падкрэслівае Алена Анісім. — Трэба, каб у кожным раённым і абласным цэнтры дзейнічала хоць бы адна ўстанова з беларускай мовай навучання.

**Галоўны спецыяліст упраўлення агульнай сярэдняй адукацыі Міністэрства адукацыі Ірына БУЛАЎКІНА** запэўнівае: усё часцей ва ўстановах адукацыі сталі адкрывацца класы з беларускай мовай навучання для аднаго, двух, трох вучняў. І заснавальнікаў устаноў адукацыі — аддзелы адукацыі, спорту і турызму — міністэрства арыентуе на правядзенне гутарак з бацькамі будучых першакласнікаў, каб тыя выбіралі беларускую мову як прыярытэтную. На папулярызацыю мовы скіраваны правядзенне ў школах Тыдня роднай мовы, а ў дзіцячых садках — рэгулярных дзён беларускай мовы, сустрэчы з беларускімі пісьменнікамі, наведванне літаратурных музеяў.

Але, напрыклад, бацькі ставяць пад сумненне эфектыўнасць выкладання ў пачатковай школе беларускай мовы. Ёсць меркаванне, што яна выкладаецца як замежная (усё з рускай мовы перакладаецца на беларускую), таму і стаўленне да яе ў дзяцей адпаведнае. У дзіцячых садках выхавальнікі не валодаюць беларускай мовай, таму дні роднай мовы ператвараюцца ў фармальнасць. А ў пачатковай школе на рускую мову адводзіцца больш гадзін...

— Пачынаючы з гэтага навучальнага года ў 2-м класе на вывучэнне беларускай і рускай моў выдзяляецца аднолькавая колькасць гадзін (незалежна ад мовы навучання ва ўстанове). На наступны год аднолькавая колькасць гадзін будзе ў трэцім, а праз год — і ў чацвёртым класах, — паведаміла ўдзельнікам круглага стала Ірына Булаўкіна. Такім чынам пачатковая школа паступова прыйдзе да аднолькавай колькасці гадзін па беларускай і рускай мовах. Толькі ў першым класе мы вырашылі пакінуць усё па-ранейшаму, бо там дзеткі толькі вучацца чытаць і пісаць...

Акрамя таго, вучні 10-х класаў сярэдніх школ могуць вывучаць беларускую мову і літаратуру на павышаным узроўні ў рамках профільнага навучання. У такіх класах раскладам прадугледжаны тры гадзіны на вывучэнне беларускай мовы і літаратуры ў тыдзень.

**«Бацькі ставяць пад сумненне эфектыўнасць выкладання ў пачатковай школе беларускай мовы. Ёсць меркаванне, што яна выкладаецца як замежная».**

Ірына Булаўкіна таксама паведаміла, што Міністэрствам адукацыі прынята рашэнне, што з наступнага навучальнага года ўсе інструкцыйна-метадычныя пісьмы па вучэбных прадметах будуць рыхтавацца для педагогаў на дзвюх мовах: беларускай і рускай. Раней на беларускай мове рыхтаваліся толькі пісьмы для педагогаў пачатковай школы і настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры.

## Мэта, дзеля якой варта жыць

Падчас круглага стала прагучала прапанова: для таго, каб забяспечыць выкладанне ўсіх прадметаў у школе на беларускай мове, трэба забяспечыць падрыхтоўку педагагічных кадраў з адпаведнай моўнай кампетэнцыяй. Ці хоць бы ствараць беларускамоўныя плыні і групы ў педагагічных універсітэтах і на педагагічных спецыяльнасцях.

А вось стварэнне ў Беларусі Нацыянальнага ўніверсітэта з беларускай мовай навучання — пакуль дыскусійная тэма.

— Міністр адукацыі Ігар Карпенка сказаў, што гэта пытанне патрабуе вывучэння. Мы сабралі з нашых універсітэтаў інфармацыю, каб атрымаць карціну наконт перспектыў пашырэння выкарыстання ў адукацыйным працэсе ў вышэйшай школе беларускай мовы і магчымасцяў выкладання на ёй, — праінфармаваў удзельнікаў круглага стала **галоўны спецыяліст упраўлення вышэйшай адукацыі Міністэрства адукацыі Сяргей КУЛЬ.** — Усе ВНУ запэўнілі, што ў студэнтаў першага курса абавязкова пытаюцца, на якой мове яны жадаюць навучацца, але большасць з іх выбіраюць рускую. Таму набраць групу з 20 студэнтаў для арганізацыі навучання на беларускай мове не атрымліваецца. На сённяшні дзень у 21 ВНУ пацвердзілі, што яны з некаторымі агаворкамі гатовы перайсці на выкладанне на беларускай мове, у першую чаргу, гуманітарных дысцыплін. Філасофію, гісторыю, псіхалогію можна лёгка ўспрымаць і на беларускай мове. З іншага боку, калі нашы выпускнікі едуць у Чэхію ці Польшчу, то за кароткі тэрмін яны асвойваюць там чужую мову, на якой збіраюцца атрымліваць вышэйшую адукацыю. А тут размова ідзе пра родную мову...

**«Усе законы, заканадаўчыя акты, указы Прэзідэнта павінны распрацоўвацца, абмяркоўвацца і зацвярджацца на дзвюх дзяржаўных мовах. Тады абодва варыянты будуць мець юрыдычную сілу».**

Выкажу ўласныя думкі: на мой погляд, патрабуецца нейкае палітычнае рашэнне, каб частка дысцыплін у нашых ВНУ выкладалася па-беларуску. А вось ці варта ствараць Нацыянальны ўніверсітэт, так бы мовіць, з нуля, ці нават на базе нейкай дзеючай ВНУ? Сёння паміж універсітэтамі ідзе жорсткая барацьба за абітурыентаў. Мне падаецца, што змагацца за Нацыянальны ўніверсітэт ёсць сэнс у чужой краіне, калі ты адносішся да нацыянальнай меншасці...

Аляксандр Лукашанец лічыць, што беларуская мова павінна перастаць быць фактарам канфрантацыі беларускага грамадства. Наадварот, яна павінна стаць адным з сімвалаў яго яднання. З беларускай мовы павінны быць зняты любыя ідэалагічныя і палітычныя ярлыкі. Прапагандай беларускай мовы павінны займацца людзі аўтарытэтныя і паважаныя. Беларуская мова павінна прапагандавацца на ўсіх узроўнях, у першую чаргу, у сферы навучання, у афіцыйнай дзяржаўнай дзейнасці і сродках масавай інфармацыі. І, можа, тады ў Дзень роднай мовы, калі прынята перш за ўсё згадваць мовы, якія знаходзяцца пад пагрозай заняпаду ці знікнення, мы будзем разважаць не пра беларускую мову, а пра мовы прадстаўнікоў нацыянальных меншасцяў, што пражываюць у нашай краіне. Дзеля гэтай мэты варта і жыць, і працаваць...

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

---

■ Новыя кнігі

# КРЫЛЫ І ХУТКАСЦЬ

**«Вясну сустракайце з вершамі», — заклікае лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Мікола Мятліцкі, якога мы толькі што павіншавалі з выхадам новай кнігі паэзіі. Зборнік вершаў і паэм знанага айчыннага майстра мастацкага слова «Прысутнасць» пабачыў свет у выдавецтве «Мастацкая літаратура».**




Адзін з твораў, які адкрывае кнігу, — верш «Беларускае кнігавыданне» (з прысвячэннем «да 500-годдзя»). Зразумела, да 500-годдзя выдання першай беларускай кнігі. «Толькі ўсёмагутнымі рукамі/ Народа майго/ Можна том гэты ёмісты/ Узняць над зямлёй/ І разгарнуць,/ Каб тыя, што яго стварылі/ І ўжо сёння ля зорак,/ Змаглі прачытаць/ У 500-гадовым аб'ёме/ Нашу кнігу жыцця», — піша Мікола Мятліцкі.

Гартаючы старонкі «Прысутнасці», неўпрыкмет згадваеш ранейшыя кнігі таленавітага майстра — і першы зборнік «Абеліск у жыце», і «Ружу вятроў», «Шлях чалавечы», «Бабчын»... Новая кніга — гэта вершы, якія напісаны нядаўна, у апошнія гады, і творы ранейшага часу. Паэт паўстае ва ўсім сваім творчым абліччы. Відавочная і геаграфія мастацкіх зацікаўленняў, і проста палітра чалавечых, грамадзянскіх інтарэсаў аўтара.

З паэзіяй летапісца чарнобыльскай тэмы, летапісца сённяшняга дня чытач мае магчымасць больш пільна і ўважліва ўзірацца ў Час, весці свой дыялог з рознымі з'явамі жыцця.

Томік «Прысутнасці» выдадзены накладам у 2050 экзэмпляраў. Уражлівы для паэзіі тыраж. Можна толькі падзякаваць і выдавецтву, і Міністэрству інфармацыі краіны за такі падарунак аматарам паэтычнага слова. Хапае ў творах М. Мятліцкага і хуткасці, і засяроджанасці, што вылучае шырокую прастору для разважлівага, удумлівага чытання. Ёсць у вершах і «ўзлёт непакоры і духу», і «цяпло чалавечай спагады», і шмат што яшчэ роднае і крынічнае, мілагучнае і светлае...

**Кастусь ЛАДУЦЬКА** ■

# ОАО «Витебские ковры»

## ИЗВЕЩАЕТ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА, ПРИНАДЛЕЖАЩЕГО ОАО «ВИТЕБСКИЕ КОВРЫ»

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| ЛОТ 1 | |
| Машина для разработки свальной шерсти МАРШ, инв.№1290 | Производитель — Калининский механический завод, РФ.<br>Назначение – разработка свальной шерсти.<br>Бывшая в употреблении, введена в эксплуатацию 01.12.1992.<br>Количество ступеней разработки шерсти – 2 шт. Диаметр барабанов – 720 мм.<br>Начальная цена продажи – 2160 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка – 216 рублей |
| ЛОТ 2 | |
| Обезрепеивающая машина О-120-ШМ2, инв.№1241 | Производитель — Пресненский машиностроительный завод, РФ.<br>Назначение – удаление из шерсти цепких растительных примесей механическим способом.<br>Бывшая в употреблении, введена в эксплуатацию 01.12.1988.<br>Рабочая ширина машины — 1200 мм.<br>Диаметры рабочих органов: колковый барабан – 400 мм, бильный барабан – 500 мм, главный барабан – 580 мм, гребенной барабан – 700 мм.<br>Начальная цена продажи – 1800 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка – 180 рублей |
| ЛОТы 3–6 | |
| Чесальные аппараты CR-643: | Производитель – ф. «Бефама», Польша.<br>Назначение – получение из смеси волокон сформированного однородного продукта в виде ровницы.<br>Бывшие в употреблении.<br>Рабочая ширина – 2000 мм. Число прочесов – 2,3 |
| Чесальный аппарат CR-643, инв.№2699 | ЛОТ 3<br>Введен в эксплуатацию 01.01.2006.<br>Начальная цена продажи – 4760 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка – 476 рублей |
| Чесальный аппарат CR-643, инв.№1187 | ЛОТ 4<br>Введен в эксплуатацию 01.04.2002.<br>Начальная цена продажи – 4760 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка – 476 рублей |
| Чесальный аппарат CR-643, инв.№1106 | ЛОТ 5<br>Введен в эксплуатацию 01.08.2001.<br>Начальная цена продажи – 5400 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка – 540 рублей |
| Чесальный аппарат CR-643, инв.№1185 | ЛОТ 6<br>Введен в эксплуатацию 01.02.2000.<br>Начальная цена продажи – 4760 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка – 476 рублей |
| ЛОТы 7-13 | |
| Чесальные аппараты CR-24: | Производитель – ф. «Бефама», Польша.<br>Назначение – получение из смеси волокон сформированного однородного продукта в виде ровницы.<br>Бывшие в употреблении.<br>Рабочая ширина – 1800 мм. Число прочесов – 2 |
| Чесальный аппарат CR-24, инв.№1114 | ЛОТ 7<br>Введен в эксплуатацию 11.02.2003.<br>Начальная цена продажи – 4290 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка – 429 рублей |
| Чесальный аппарат CR-24, инв.№1118 | ЛОТ 8<br>Введен в эксплуатацию 05.03.2003.<br>Начальная цена продажи – 4290 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка – 429 рублей |
| Чесальный аппарат CR-24, инв.№1003 | ЛОТ 9<br>Введен в эксплуатацию 01.06.2003.<br>Начальная цена продажи – 4290 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка – 429 рублей |
| Чесальный аппарат CR-24, инв.№1002 | ЛОТ 10<br>Введен в эксплуатацию 01.08.2003.<br>Начальная цена продажи – 4290 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка – 429 рублей |
| Чесальный аппарат CR-24, инв.№1000 | ЛОТ 11<br>Введен в эксплуатацию 01.11.2003.<br>Начальная цена продажи – 4290 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка – 429 рублей |
| Чесальный аппарат CR-24, инв.№1001 | ЛОТ 12<br>Введен в эксплуатацию 01.11.2003.<br>Начальная цена продажи – 4290 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка – 429 рублей |
| Чесальный аппарат CR-24, инв.№1194 | ЛОТ 13<br>Введен в эксплуатацию 05.09.2004.<br>Начальная цена продажи – 4290 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка – 429 рублей |
| ЛОТы 14–27 | |
| Прядильные машины ПБ-114-Ш: | Производитель – ф. «Бефама», РФ.<br>Назначение – получение из смеси волокон сформированного однородного продукта в виде ровницы.<br>Бывшие в употреблении.<br>Рабочая ширина – 2000 мм. Число прочесов – 2,3 |
| Прядильная машина ПБ-114-Ш, инв.№2764 | ЛОТ 14<br>Введена в эксплуатацию 07.09.2006.<br>Начальная цена продажи – 1800 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка –180 рублей. |
| Прядильная машина ПБ-114-Ш, инв.№1050 | ЛОТ 15<br>Введена в эксплуатацию 01.01.2001.<br>Начальная цена продажи – 1800 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка –180 рублей. |
| Прядильная машина ПБ-114-Ш, инв.№1182 | ЛОТ 16<br>Введена в эксплуатацию 01.01.2000.<br>Начальная цена продажи – 1800 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка –180 рублей |

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| Прядильная машина ПБ-114-Ш, инв.№1181 | ЛОТ 17<br>Введена в эксплуатацию 01.01.2000.<br>Начальная цена продажи – 1800 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка –180 рублей |
| Прядильная машина ПБ-114-Ш, инв.№1180 | ЛОТ 18<br>Введена в эксплуатацию 01.12.1999.<br>Начальная цена продажи – 1800 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка –180 рублей |
| Прядильная машина ПБ-114-Ш, инв.№1124 | ЛОТ 19<br>Введена в эксплуатацию 02.01.2003.<br>Начальная цена продажи – 1800 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка –180 рублей. |
| Прядильная машина ПБ-114-Ш, инв.№1534 | ЛОТ 20<br>Введена в эксплуатацию 02.03.2004.<br>Начальная цена продажи – 1800 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка –180 рублей |
| Прядильная машина ПБ-114-Ш, инв.№1533 | ЛОТ 21<br>Введена в эксплуатацию 05.07.2004.<br>Начальная цена продажи – 1800 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка –180 рублей |
| Прядильная машина ПБ-114-Ш, инв.№1113 | ЛОТ 22<br>Введена в эксплуатацию 01.10.2001.<br>Начальная цена продажи – 1800 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка –180 рублей |
| Прядильная машина ПБ-114-Ш, инв.№1068 | ЛОТ 23<br>Введена в эксплуатацию 01.03.2001.<br>Начальная цена продажи – 1800 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка –180 рублей |
| Прядильная машина ПБ-114-Ш, инв.№1051 | ЛОТ 24<br>Введена в эксплуатацию 01.01.2001.<br>Начальная цена продажи – 1800 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка –180 рублей |
| Прядильная машина ПБ-114-Ш, инв.№1126 | ЛОТ 25<br>Введена в эксплуатацию 01.12.1998.<br>Начальная цена продажи –1800 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка – 180 рублей |
| Прядильная машина ПБ-114-Ш, инв.№1127 | ЛОТ 26<br>Введена в эксплуатацию 01.12.1998.<br>Начальная цена продажи – 1800 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка –180 рублей |
| Прядильная машина ПБ-114-Ш, инв.№1128 | ЛОТ 27<br>Введена в эксплуатацию 01.12.1999.<br>Начальная цена продажи – 1800 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка –180 рублей |
| ЛОТы 28–29 | |
| Крутильные машины К-176-2: | Производитель — Серпуховский механический завод.<br>Назначение – кручение пряжи номеров 2–5 из шерстяных, хим.волокон и их смесей в два и более сложений.<br>Бывшие в употреблении.<br>Число веретен на машине – 148 шт. Расстояние между веретенами 176 мм. Скорость веретен – 2500–3200 м/мин., диаметр кольца – 140 мм |
| Крутильная машина К-176-2, инв.№2854 | ЛОТ 28<br>Введена в эксплуатацию 20.08.2007.<br>Начальная цена продажи – 1620 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка – 162 рублей |
| Крутильная машина К-176-2, инв.№1098 | ЛОТ 29<br>Введена в эксплуатацию 01.12.1965.<br>Начальная цена продажи – 1620 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка – 162 рублей |
| **Местонахождение объектов** | Витебская обл., г. Витебск, ул. М. Горького, 75 |
| **Банковские реквизиты для перечисления задатка** | Задаток перечисляется по 02.04.2017 включительно:<br>резидентом Республики Беларусь, – бел. рублях;<br>нерезидентом Республики Беларусь, – в бел. рублях либо в иностранной валюте по следующим курсам:<br>EUR 1 Евро 2,0<br>USD 1 Доллар США 1,9<br>RUB 100 Российских рублей 0,032<br>**Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе по продаже имущества ОАО «Витебские ковры» (Лот (Лоты) №___), проводимом 03.04.2017 г. Получатель – ОАО «Витебские ковры».<br>р/с в **бел. рублях** – №3012410112017 в дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Витебской области, 210005, г. Витебск, ул. Ленина, 22/16, код 153001739, УНП 300082076, ОКПО 00311786<br>р/с в **иностранной валюте**:<br>банк получателя: ПАО Сбербанк г.Москва, полное наименование: Публичное акционерное общество «Сбербанк России» ИНН 7707083893, БИК 044525225, к/с 30101810400000000225 в ГУ Банка России по ЦФО<br>SWIFT код SABRRUMM<br>Получатель ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, Республика Беларусь,<br>к/с RUB 30111810800000000154<br>к/с USD 30111840100000000154<br>к/с EUR 30111978700000000154<br>УНП 807000028, SWIFT код BLBBBY2X<br>Цель платежа: для Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Витебской области код 739, для зачисления на счет ОАО «Витебские ковры»<br>RUB 3012410112802<br>USD 3012410112509<br>EUR 3012410112512 |
| **Прием заявлений** | По 02.04.2017 г. включительно в рабочие дни с 8.15 до 12.30, с 13.15 до 17.00 по адресу: г. Витебск, ул. М. Горького, 75, 2-й этаж, каб. главного инженера. Подача заявления производится лично главному инженеру ОАО «Витебские ковры», а также путем направления документов по почте, эл. почте либо посредством факсимильной связи |

| | |
|---|---|
| **Шаг аукциона** | 5% |
| **Продавец (организатор)** | ОАО «Витебские ковры»,<br>210002, г. Витебск, ул. М. Горького, 75 |
| **Условия аукциона** | Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Лот (Лоты) по начальной цене, увеличенной на 5%, – Претендент на покупку должен подписать с Продавцом договор купли-продажи Лота (Лотов) в течение 10 (десяти) календарных дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.<br>На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.<br>Возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется победителем торгов (единственным участником торгов) по фактическим затратам, определенным в соответствии с законодательством. Победитель торгов (единственный участник торгов) обязан перечислить на текущий (расчетный) банковский счет сумму затрат на организацию и проведение торгов в течение 3 (трех) рабочих дней со дня их проведения. После предъявления копии платежных документов о перечислении суммы затрат на организацию и проведение торгов в установленном порядке в соответствии с подписанным в день проведения торгов соответствующим протоколом между продавцом предмета торгов и победителем торгов (единственным участником торгов) заключается договор купли-продажи предмета торгов |
| **Условия оплаты** | 100% предварительная оплата. Победитель аукциона перечисляет предоплату на р/с Продавца в течение 5банковских дней с момента заключения договора купли-продажи (резиденты Республики Беларусь производят оплату в бел. рублях, нерезиденты Республики Беларусь – в бел. рублях либо в иностранной валюте по следующим курсам:<br>EUR 1 Евро 2,0<br>USD 1 Доллар США 1,9<br>RUB 100 Российских рублей 0,032 |

**Аукцион состоится 03.04.2017 в 11.00 по адресу:**
**г. Витебск, ул. М.Горького, 75, 2-й этаж, каб. главного инженера**

Участниками торгов могут быть юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, а также иностранные юридические лица и индивидуальные предприниматели, граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, лица без гражданства, подавшие заявление на участие в аукционе (форма заявления находится на сайте Продавца); предоставившие заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка и заключившие с Продавцом аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (форма соглашения находится на сайте Продавца), а также прилагаются следующие документы:

документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка;

юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель);

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

Сведения об участниках не подлежат разглашению.

